

СВЯТА, ЯКОЕ ЯДНАЕ



ЁСЦЬ І БУДУЦЬ Ў МСЦІСЛАВЕ КАВАЛІ...

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ВЕРАСНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 180 (29802)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ЖЫДКОЎ, старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам»:**

*«Плануем на 20 тысяч тон больш цукру сёлета закласці на захоўванне з мэтай забеспячэння ўнутранага рынку. У нас у гэтым годзе 380 тыс. тон цукру было спажыта пры тым, што быў шэраг пікавых момантаў, выкліканых ажыятажным попытам і ў летні, і ў вясновы перыяды. З улікам гэтага мы і плануем закласці не менш за 400 тысяч тон на захоўванне для забеспячэння ўнутранага рынку цукрам у бесперабойнай колькасці і ў дастатковым аб'ёме. Слуцкі цукрарафінадны камбінат быў запушчаны 6 верасня, а неўзабаве пасля яго — Скідальскі і Гарадзейскі цукровыя камбінаты. Штодзённа плануецца перапрацоўваць 39,5 тысячы тон цукровых буракоў. Беларускі цукар будзем і экспартаваць. На карце экспарту — традыцыйныя ўсходнія партнёры: Расія, Кітай, Казахстан, Таджыкістан і Узбекістан».*

## КОРАТКА

• Мінсельгасхарч: вырашчанай прадукцыі будзе дастаткова для фарміравання стабфонду.

• **Аперацыю па імплантацыі штучнага жалудачка сэрца дзіцяці 8 гадоў упершыню правілі ў Беларусі.**

• Авіяцыя МНС Беларусі тушыць лясныя пажары ў Турцыі: ужо здзейснена 169 вылетаў.

З першых вуснаў

# «ВАС АБ'ЯДНОЎВАЕ АДЗІН ЛЁС — ЛЁС НАШАЙ РОДНАЙ БЕЛАРУСІ»

## Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды



Фота БелТА.

Вучань Макранскай сярэдняй школы Маларыцкага раёна Багдан ШЭЛЕГ узнагароджаны медалём «За выратаванае жыццё».

**Суайчыннікаў, якія вызначыліся ў працоўнай дзейнасці і праявілі свае найвышэйшыя чалавечыя якасці, ушаноўвалі ў Палацы Незалежнасці напярэдадні дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства.**

Адпаведны Указ «Аб узнагароджанні» кіраўнік дзяржавы падпісаў 9 верасня. Усяго высокіх узнагарод удастоены 160 прадстаўнікоў розных галін дзейнасці. Ордэны, медалі і ганаровыя званні з рук кіраўніка дзяржавы атрымалі найлепшыя настаўнікі, аграрыі, будаўнікі, журналісты, навукоўцы, артысты, рабочыя, ваеннаслужачыя. Узнагароды ім прысвоены за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, сярод узнагароджаных — беларусы, якія сваім талентам, працавітасцю дасягнулі вялікіх вышынь у вытворчай і творчай дзейнасці, у служэнні Радзіме і свайму народу.

СТАР. 2

# УДЗЯЧНАЯ ПАМЯЦЬ



**Куды ні паедзь у нашай краіне, у кожным яе рэгіёне абавязкова ўбачыш брацкую магілу або мемарыял Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі ад фашысцкай навалы каштавала дзясяткаў тысяч жыццяў салдат і афіцэраў. Гінулі на гэтай зямлі за нашу свабоду і за права жыць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, прычым не толькі грамадзяне Савецкага Саюза. Вечны спачын і ўшанаванне знайшлі чэхі і балгары, палякі і французы... Аб гэтых людзях, а таксама аб слаўных сынах народаў СССР, якія па-геройску загінулі за вызваленне Беларусі ад фашыстаў, мы раскажам у новым праекце «Звязды» «Удзячная памяць». Мы не дзелім іх па нацыянальнасцях, для нас яны ўсе — ВЫЗВАЛІЦЕЛІ. Памятаць аб іх, ведаць аб іх — гэта тое, што не толькі можам, але і абавязаны зрабіць мы, за чыё жыццё яны аддалі свае жыцці.**

*А першы матэрыял нашага праекта — аб подзвігу салдат польскай дывізіі, якія паляглі, змагаючыся за вышыню каля вёскі Леніна ў Горацкім раёне.*

СТАР. 5




# ШПАЦЫР БЕЗ ЭКСТРЫМУ

## Як не згубіцца ў лесе?

**Нягледзячы на забароны на наведванне лясоў, якія з-за высокай пажарнай небяспекі яшчэ лічаныя дні таму былі актуальныя для некаторых рэгіёнаў краіны, нашы людзі, як гэта часта бывае, не маглі прапусціць грыбны сезон. І калі сур'ёзных пажараў, на шчасце, удалося пазбегнуць, то без пошуку аматараў ціхага палявання, якія не здолелі самастойна знайсці дарогі дахаты, не абышлося.**

### Не вярнуліся дамоў

Больш чым суткі ратавальнікі шукалі пенсіянерку ў Барысаўскім раёне. Жанчына, якая прыехала ў сельскую мясцовасць з раённага цэнтра, накіравалася збіраць ягады. У сваю вясковую хату, з якой выправілася ў лес, яна не вярнулася. Звязацца з ёй таксама не ўдалося — мабільнага тэлефона ў жанчыны не было. Трывогу забіла дачка. Вечарам таго ж дня яна тэлефанавала маці, аднак трубку ніхто не зняў. Сваякі, якія пасля прыехалі па вясковым адрасе жанчыны, ўбачылі, што дзверы замкнутыя. Дачка пенсіянеркі звярнулася ў праваахоўныя органы. Супрацоўнікі міліцыі перадалі інфармацыю ратавальнікам.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22180

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ВАС АБ'ЯДНОЎВАЕ АДЗІН ЛЁС — ЛЁС НАШАЙ РОДНАЙ БЕЛАРУСІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У Год гістарычнай памяці лічу важным падкрэсліць, што дзень 17 верасня вярнуўся ў наш святочны каляндар не толькі як напамін аб каштоўнасці свабоды і незалежнасці, але і як даніна эпосе, якая падарыла нам, беларусам, права заняць сваё месца на карце свету», — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Будзем памятаць пра гэта, як і тое, што мы адбыліся як народ, як нацыя, як дзяржава, перамаглі ў Вялікай Айчыннай вайне, адрадзілі краіну з попелу і нават апярэдзілі некаторых у засваенні космасу, ядзернай энергетыцы, біятэхналогій дзякуючы людзям працы, людзям, якія заўсёды ставілі інтарэсы дзяржавы вышэй за асабістыя. Такім, як вы».

Заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды — ордэны, медалі, званні — знайшлі сваіх герояў. «Вы ішлі да іх, як часта бывае ў жыцці, праз узлёты і падзенні, праз цяжкасці і перашкоды, але заўсёды ішлі сумленна і годна, — звярнуўся да ўзнагароджаных Аляксандр Лукашэнка. — У кожнага за плячыма — свая жыццёвая гісторыя і свой шлях. Усіх вас аб'ядноўвае адзін лёс — лёс нашай роднай Беларусі, слаўны летапіс якой мы з вамі працягваем. У маіх вачах кожная гісторыя заслугоўвае асобнага апавядання, асобных слоў падзякі. Але не ўсё, на жаль, можна агучыць».

Асобна ён удзяліў увагу зусім юнаму грамадзяніну Беларусі, чалавеку з вялікім сэрцам. Медаль «За выратаванае жыццё» быў уручаны Багдану Шэлегу, навучэнцу 8 класа Макранскай сярэдняй школы. Прэзідэнт расказаў, што хлопчык на абпаленых руках вынес з агню дзвюх малодшых сясцёр. Разбіў акно і скокнуў у палаючы дом, не думаючы пра сябе. «Гэта будучыня. Такія героі павінны быць у Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў узнагароджаных з надыходзячым святам — Днём народнага адзінства. «Няхай заслужаныя ўзнагароды і званні стануць чарговай прыступкай да новых прафесійных і творчых перамог у вашым жыцці», — пажадаў ён.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

Самы юны і бадай ці не самы смелы герой дня — **вучань Макранскай сярэдняй школы (Маларыцкі раён) Багдан ШЭЛЕГ** — узнагароджаны медалём «За выратаванае жыццё». У лютым гэтага года 13-гадовы хлопчык выратаваў сваіх малодшых сясцёр. Раніцай, калі дзеці яшчэ спалі, а бацькі ўжо былі на працы, у доме здарыўся пажар. Хлопчык не разгубіўся, разбудзіў сясцёр Паліну і Еву і загадаў ім легчы на падлогу. Паколькі выйсці з дому праз ахоплены полымем калідор было немагчыма, Багдан разбіў рукой акно і выцягнуў дзяўчынак. У сваёй школе Багдан адразу стаў героем. Цяпер яго подзвіг ацанілі і на самым высокім узроўні.

«Я моцна хваляваўся перад тым, як атрымаць узнагароду з рук Прэзідэнта, — прызнаўся Багдан. — У школе былі вельмі здзіўлены, калі даведаліся, што Прэзідэнт будзе ўручаць мне медаль. Калі б можна было ўсё вярнуць назад, у мяне не было б шрамаў, я не пацярпеў бы ад пажару, і сёстры таксама. Я думаў пра тое, што я магу загінуць, але мне больш хацелася выратаваць сясцёр. У іх зараз усё добра, пра пажар не ўспамінаюць. І скажу шчыра: я сябе за гэта лічу героем, бо я выратаваў жыццё».

Аб прысваенні ордэна Пашаны **майстар Віцебскага цэха вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскдругчормет» Юрый РАСЛЯКОЎ** даведаўся ў свой дзень нараджэння — менавіта ў гэты дзень, 9 верасня, кіраўнік дзяржавы падпісаў адпаведны ўказ. Прызнаецца, што падобнага падарунка за ўсё сваё жыццё не атрымліваў. Хвалявання не схаваць — атрымаць з рук Прэзідэнта такую высокую ўзнагароду надзвычай адказна і ганарова. І гэта нягледзячы на тое, што падобны вопыт ужо быў — гадоў 15 таму Юрый Расляковў быў уганараваны медалём «За працоўныя заслугі», які таксама ўручаў Аляксандр Лукашэнка.

Юрый — чалавек вельмі сціплы. «Я працую не дзеля славы, — кажа ён. — Проста люблю сваю работу. Маё кіраўніцтва ў курсе, што я на работу іду як на свята». За плячыма Юрыя Раслякова — 39 гадоў працы на прадпрыемстве. У свой час як прыйшоў сюды адразу пасля арміі рабочым, так і застаўся, аб чым ніколькі не шкадуе, хоць, прызнаецца, былі розныя прапановы аб працаўладкаванні. «Работу проста трэба палюбіць», — дзеліцца ён сакрэтам бесперапыннага стажу на адным працоўным месцы.

Цырымонія ўзнагароджання — даволі хвалюючая падзея нават для людзей у пагонах. **Начальнік Інстытута пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Сяргей ЖЫЛІНСКІ** не раз атрымліваў з рук кіраўніка дзяржавы ўзнагароды. Праўда, дагэтуль былі медалі. Цяпер на яго парадным кіцелі з'явіўся першы ордэн — «За службу Радзіме» III ступені.

«Гэта заслуга ўсяго майго калектыву, выпускнікоў Інстытута пагранічнай службы, якія сёння годна выконваюць задачы па ахове Дзяржаўнай граніцы нашай краіны, — заўважыў Сяргей Жылінскі. — Выхоўваць будучых пагранічнікаў вельмі адказна. Сённяшнія нашы выпускнікі сутыкаюцца з сур'ёзнымі выклікамі бяспекі для нашай краіны, і яны першымі прымаюць рашэнне па недапушчэнні шматлікіх правакацый і парушэнняў на Дзяржаўнай граніцы».

# ДЗЕЛЯ НАРОДА І БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**Напярэдадні Дня народнага адзінства ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь адбылося ўзнагароджанне работнікаў культуры, якія зрабілі значны асабісты ўклад у рэалізацыю ў 2022 годзе маштабных культурных праектаў, што паспрыялі ўзмацненню адзінства беларускага народа. Традыцыю выказваць падзяку і пашану тым, чыя прафесійная дзейнасць спрые еднасці беларусаў, распачалі летась. І хочацца верыць, што яна і працягнецца, каб краіна ведала сваіх прафесіяналаў, якія часта застаюцца за кулісамі поспеху.**



— Шчыра рады вітаць усіх вас на пляцоўцы Нацыянальнага мастацкага музея. Выказваю шчырыя словы ўдзячнасці за карпатлівую працу, за вашу творчасць, талент, накіраваны на ўзмацненне адзінства нашага народа і развіццё Беларусі, — адзначыў у прывітальным слове **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ**. — Імкненне да адзінства закладзена ў нас на генетычным узроўні.



І аб'яднанне ўсходняй і заходняй частак Беларусі ў 1939 годзе дазволіла выстаяць у страшныя гады ваеннага ліхалецця, дазволіла аднавіць эканоміку, культуру і заняць годнае месца ў міжнароднай прасторы. На сферу культуры і сёння ўскладаюцца вялікія надзеі і абавязкі. Менавіта наша місія — несці ў грамадства высокую духоўнасць і напаўняць навакольны свет пачуццямі дабра, любові, павагі і радасці.

Бягучы 2022 год, па словах міністра, азнаменаваны шэрагам яркіх і цікавых культурных падзей і мерапрыемстваў. Сярод іх — адкрыццё помніка мітрапаліту Філарэту, канцэртная праграма, што была арганізавана ў рамках Форуму рэгіёнаў у Гродне. Незабыўныя ўражанні пакінулі мерапрыемствы падчас святкавання Дня Перамогі і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Нельга не згадаць і правядзенне фестываляў «Александрыя збірае сяброў», «Славянскі базар у Віцебску» і многае іншае, што запомнілася гледачам і шматлікім турыстам.

— Асаблівы гонар і словы ўдзячнасці хочацца выказаць маладым творчым супрацоўнікам. Тым, хто сваім талентам праславіў нашу Беларусь далёка за яе межамі. Гэта Елісей Касіч і Ганна Трубяцкая, якія ўзялі Гран-пры на міжнародных конкурсах «Славянскага базару». Безумоўна, за іх вынікам стаіць каласальная праца ўсёй іх каманды. І такімі мерапрыемствамі, я ўпэўнены, мы ўпісваем новыя старонкі ў гісторыю сучаснай Беларусі і паказваем усёй сусветнай супольнасці, наколькі багатая наша краіна на таленты, — сказаў Анатоль Маркевіч.

Так, за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю нацыянальнай культуры, актыўны ўдзел у правядзенні значных культурных мерапрыемстваў ганаровай граматай Міністэрства культуры ўзнагародзілі дырэктара прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ» Анжаліну Мікульскую, намесніка дырэктара прадзюсарскай студыі, прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ» Кацярыну Блізнец, кіраўніка заслужанага калектыву тэатра эстраднай песні «Сябрынка» Палаца культуры МАЗ Таццяну Трухан, дацэнта кафедры эстраднай музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Дзіну Тыцюк, мастацкага кіраўніка прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ» Леаніда Шырына, скульптара, члена Беларускага саюза мастакоў Андрэя Хацяноўскага.

— Для мяне важная ацэнка маёй працы, але я ніколі яе не чакала. Я заўсёды працавала па максімуме, каб перадаць сваім шматлікім вучням усё, што магла. Таму, безумоўна, прыемна, што зробленае мной заўважылі, тым больш што я амаль паўстагоддзя займаюся педагогікай, — кажа **дацэнт кафедры эстраднай музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Дзіна ТЫЦЮК**. — Адметна і тое, што мы сустрэліся тут напярэдадні Дня народнага адзінства, і мне вельмі хацелася б, каб гэтае свята мела ўсё больш нефармальны характар, каб мы былі па-сапраўднаму адзінымі. Бо мяне вельмі непакояць моманты нашай некаторай раз'яднанасці, нязгоды, адсутнасці нейкага глыбіннага разумення і жадання быць адзіным народам, працаваць дзеля гэтага штодня, кожны на сваім месцы.

Таксама знайшлі сваіх уладальнікаў падзякі міністра культуры Рэспублікі Беларусь. Тут сярод узнагароджаных генеральны дырэктар Белдзяржфілармоніі Аляксандр Нікіта, мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Дзяржаўнага камернага хору Белдзяржфілармоніі Наталля Міхайлава, галоўны рэжысёр Мінскага гарадскога палаца культуры Наталля Русецкая і іншыя. Пасля завяршэння цырымоніі ўзнагароджання прысутным быў прапанаваны святочны канцэрт, які падрыхтавалі сумесна студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а таксама экскурсія па Нацыянальным мастацкім музеі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Запасы нафты ў ЗША скараціліся да ўзроўню 1984 года



Мінэнерга ЗША паведаміла, што толькі за апошні тыдзень рэзервы ў краіне скараціліся на 8,4 мільёна барэляў. Увогуле нафтавыя запасы Амерыкі ўпалі да паказчыкаў 1984 года. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва Reuters. Раней агенцтва Bloomberg паведамляла, што ЗША расходуюць свае стратэгічныя рэзервы нашмат хутчэй, чым чакалася. Калі Вашынгтон і далей у спробах стрымлівання цэн на сусветным рынку энерганосьбітаў будзе прытрымлівацца бягучых тэмпаў продажу, то да канца кастрычніка нафтавыя рэзервы Амерыкі могуць скарaціцца да 40-гадовага мінімуму ў 358 мільёнаў барэляў. Адзначаецца, што яшчэ год таму стратэгічныя запасы нафты ў ЗША складалі 621 млн барэляў.

### Жыхарам Нідэрландаў раздаюць таймеры для скарачэння часу прыёму душа

У Нідэрландах заклікаюць людзей скарачаць час прыёму душа да пяці хвілін. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на Wall Street Journal. Мясцовыя ўлады адной з правінцый гэтай краіны пачалі раздаваць жыхарам таймеры. З пункту гледжання кіруючых органаў, гэта павінна падштурхнуць людзей да эканоміі гарачай вады падчас прыняцця душу, што ў сваю чаргу дапаможа скараціць спажыванне газу ў краіне.

### Памёр вядомы рэжысёр Жан-Люк Гадар



Французскі рэжысёр Жан-Люк Гадар памёр на 92-м годзе жыцця, паведаміла выданне Libеration. Пазней гэтую інфармацыю таксама пацвердзіла газета Le Monde. Аб прычынах смерці рэжысёра не паведамляецца. Гадар нарадзіўся 3 снежня 1930 года. Ён стаяў каля вытокаў «новай хвалі» ў кіно — кірунку канца 1950—1960-х гадоў. Дэбютным поўнаметражным фільмам Гадара была карціна «На апошнім дыханні», галоўную ролю ў якой сыграў Жан-Поль Бельмандо. Гэты фільм, які выйшаў на экранах Францыі 16 сакавіка 1960-га, назвалі маніфестам «новай хвалі». Сярод іншых найбольш вядомых карцін — «Маленькі салдат», «Пагарда», «Альфавіль», «Вар'ят П'еро». Усяго рэжысёр зняў больш за 70 карцін. Апошні з яго фільмаў — «Кніга вобразаў» — выйшаў у 2018 годзе. Бывайце, маэстра...



**Юрый ШАЎЦОЎ:**

# «ШАНХАЙСКІ ДУХ» ВЕЛЬМІ БЛІЗКІ БЕЛАРУСІ

**Заўтра пачынаецца саміт ШАС у Самаркандзе, дзе чакаецца ўдзел кіраўнікоў 15 дзяржаў і кіраўнікоў 10 міжнародных структур. На ім мяркуецца прыняць шэраг найважнейшых рашэнняў па стратэгічных кірунках. У тым ліку будзе разгледжана заяўка Беларусі на атрыманне статусу члена арганізацыі. Пра тое, што гэта прынясе нашай краіне, чаму гэтую падзею па праве можна назваць гістарычнай, чым адметны «шанхайскі дух», у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў вядомы беларускі палітолаг, усходазнаўца Юрый ШАЎЦОЎ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ❍ Даслоўна

Надыходзіць час гістарычнага стрэс-тэста Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка летась у верасні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Душанбэ. На думку беларускага лідара, аб гэтым выразна сведчаць вострыя глабальныя выклікі сучаснасці. Прэзідэнт адзначыў, што кампетэнцыя ШАС дазваляе адначасова займацца самымі разнастайнымі пытаннямі: ад бяспекі, эканамічнага развіцця, вybудоўвання новых фінансавых і гуманітарных сістэм да рэалізацыі буйных інфраструктурных праектаў. «Аднак паспяхова рэалізаваць гэтыя перавагі можна толькі сумеснымі намаганнямі, аб'яднаннем нашых патэнцыялаў на карысць нашых народаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ❍ Даведка

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — найбуйнейшая сусветная рэгіянальная платформа ўзаемадзеяння. Пра яе стварэнне было абвешчана 15 чэрвеня 2001 года ў Шанхаі Казахстанам, Кыргызстанам, Кітаем, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Да гэтага краіны працавалі ў фармаце «Шанхайскай пяцёркі» — без Узбекістана. Палітычнае аб'яднанне было заснавана на Пагадненні аб умацаванні даверу ў ваеннай галіне ў раёне граніцы (Шанхай, 1996 год) і Пагадненні аб узаемным скарачэнні ўзброеных сіл у раёне граніцы (Масква, 1997 г.). Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін (акрамя заснавальнікаў, гэта Індыя і Пакістан, якія таксама далучыліся ў 2017-м) з агульным насельніцтвам больш чым тры мільярды чалавек, якія фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. Беларусь атрымала статус назіральніка ў ШАС у 2015-м. Такі ж статус у арганізацыі маюць яшчэ тры краіны — Афганістан, Іран (летась была адобрана заяўка краіны на атрыманне статусу члена арганізацыі і распачата адпаведная працэдура) і Манголія. У ШАС таксама ёсць шэсць партнёраў па дыялогу: Азербайджан, Арменія, Камбоджа, Непал, Турцыя і Шры-Ланка. Летась заяўку на атрыманне адпаведнага статусу падалі Егіпет, Катар і Саудаўская Аравія.

***— Юрый Вячаслававіч, у чым адметнасць Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва?***

— Першапачаткова гэтая арганізацыя створана для забеспячэння бяспекі ў Еўразіі. Перш за ўсё ў Цэнтральнай Азіі. Гэты рэгіён і цяпер выбухованебяспечны. Актуальная задача — папярэдзіць экспарт ісламскага экстрэмізму, а таксама рознага роду арганізаванай злачыннасці з Афганістана на поўнач. Таксама варта мець на ўвазе, што менавіта тут знаходзіцца сусветны цэнтр вытворчасці наркотыкаў. Для гэтага было неабходна выбудаваць узаемадзеянне. І была абрана такая форма, як арганізацыя супрацоўніцтва. Па меры таго, як ШАС стала паспяховай, пачалі пашырацца задачы і кольказсць удзельнікаў. На парадку дня з'явіліся і эканамічныя пытанні. Арганізацыя пачала пераўтварацца ў дзейсную сістэму ўзаемадзеяння паміж краінамі. Асаблівасць ШАС заключаецца ў маштабе. У гэтую арганізацыю ўвайшлі абсалютна розныя краіны, якія на іншых пляцоўках не ў стане ўзаемадзейнічаць. ШАС — гэта не блок, а такая форма ўзаемадзеяння, якая робіць магчымым вырашэнне практычных пытанняў паміж удзельнікамі. Іншай формы ў сусветнай практыцы не існуе.

***— Што адбываецца на сучасным этапе яе развіцця?***

— Мы бачым, што апошнія некалькі гадоў у Еўразіі адбываецца шмат буйнамаштабных працэсаў з удзелам ключавых сусветных гульцоў, праз якія ствараецца перш за ўсё новая эканамічная інфраструктура, а таксама ў галіне бяспекі. Адзіная міжнародная арганізацыя супрацоўніцтва, на аснове якой магчыма стварыць дзейсную пляцоўку ўзаемадзеяння, гэта ШАС. Тут паказальны вопыт Ірана. У мінулым годзе быў распачаты працэс прыняцця яго ў арганізацыю. Гэтая краіна даўно знаходзіцца пад санкцыямі ЗША і Захаду. Яна імкліва развіваецца за кошт перапампоўкі даходаў ад экспарту нафты ў перапрацоўчую галіну. Паспяхова рэалізоўваецца яе атамная праграма.

Іран летась паспяхова заключыў унікальную дамову з Кітаем на 25 гадоў, так званая вялікая дамова. Яе параметры афіцыйна не агалошваюцца. З тых звестак, якія з'явіліся ў адкрытых крыніцах, стала вядома, што Іран і Кітай дамовіліся аб гарантаваных пастаўках нафты па ўзгодненай цане. Гэта азначае, што Іран сышоў ад амерыканскіх санкцый. Кітай атрымаў магчымасць інвеставаць вялізныя сродкі ў іранскую індустрыю і галоўныя аб'екты. Называецца сума ў 200 мільярдаў долараў. Для Ірана яна насамрэч вялікая. Краіна вельмі хутка здолее развіць перапрацоўчую прамысловасць і ўвогуле ўсю эканамічную інфраструктуру. Абапіраючыся ў тым ліку на кітайскія інвестыцыі. Дарэчы, такім чынам Кітай і Іран выбудавалі адносіны стратэгічнага партнёрства. Падобныя адносіны былі сфарміраваны ў Кітая з Пакістанам. Развіваецца кітайска-пакістанскі эканамічны калідор. Тут рэалізоўваюцца знакавыя праекты. Агульны аб'ём інвестыцый — амаль 60 мільярдаў долараў.

Некалькі месяцаў таму ў Тэгеране адбыўся саміт, у якім узялі ўдзел кіраўнікі Ірана, Турцыі і Расіі. Былі дасягнуты двухбаковыя дамовы. Расія пачынае інтэнсіфікаваць развіццё транспартнага калідора «поўнач-поўдзень» ад Санкт-Пецярбурга. Яшчэ згадваліся праекты ў галіне ваенна-прамысловага комплексу. Абмяркоўваюцца проста грандыёзныя праекты, накшталт канала паміж Каспійскім морам і Персідскім залівам. Так што ўваходжанне Ірана ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена адбываецца поруч з эканамічнымі пераўтварэннямі ў гэтай краіне.

***— ШАС становіцца новым цэнтрам сілы?***

— Відавочна, што пляцоўка ШАС становіцца найважнейшай альтэрнатывай групе G7. Гэтая група кіруецца Захадам, нацэлена на санкцыі. Таму ШАС аказаўся такой пляцоўкай, якая аб'яднала краіны, якія супрацьстаяць менавіта «сямёрцы». І паспяхова развіваюць супрацоўніцтва.

ШАС — пляцоўка ўзаемадзеяння культур, якія не занятыя экспартам сябе адна на адну. Такім чынам развіваецца ўзаемадзеянне розных цывілізацый, не нацэленых на паглынанне. Гэта і ёсць той самы «шанхайскі дух», які Беларусі вельмі блізкі. Узаемадзейнічаюць культуры, якія не жадаюць уніфікацыі па заходнім узоры. Тут важна імкненне выбудаваць раўнапраўны дыялог. Гэта радыкальна іншы падыход, тып узаемадзеяння, калі супрацьстаянне калектыўнаму Захаду адбываецца не праз фарміраванне антызаходняй ідэалогіі, а праз развіццё пляцоўкі ўзаемадзеяння суверэнных дзяржаўных сістэм. Пашыраецца геаграфія ШАС — шэраг краін імкнуцца пачаць працэс паэтапнай інтэграцыі ў ШАС. Афармляецца другі полюс планеты, які паспяхова супрацьстаіць англасаксам.

***— Чаго чакаць ад саміту ў Самаркандзе?***

— Зараз, у прыватнасці на саміце 15-16 верасня ў Самаркандзе, ШАС будзе ўзмацняць сваё значэнне як пляцоўкі не толькі для ўсёй Еўразіі, а і ў глабальным маштабе. Будзе завершаны працэс прыняцця Ірана, які быў распачаты летась на саміце ў Душанбэ. Будзе абмяркоўвацца шэраг пытанняў, звязаных з эканамічнымі праектамі і праблемамі ў галіне рэгіянальнай бяспекі.

Мы бачым, што многія краіны «шанхайскай сям'і» прайшлі праз крызісы, рэальнай была пагроза рэгіянальнай стабільнасці. Працэс дэстабілізацыі падаграюць знешнія сілы. Яны імкнуцца ствараць другі фронт супраць Расіі, сарваць усе транзітныя кітайскія праекты, звязаныя з новым Шаўковым шляхам. Каб не дапусціць магчымасць знешняга ўмяшальніцтва ў бяспеку ўсіх краін рэгіёна, неабходна ўзмацненне ўзаемадзеяння. Гэта будзе абмяркоўвацца на саміце ў Самаркандзе.

Адзін з пунктаў парадку дня — прыняцце Беларусі ў якасці паўнаважкага члена арганізацыі. З усіх міжнародных аб'яднанняў гэта для нас найважнейшае пасля ўзаемадзеяння з Расіяй. Станоўчае рашэнне саміту дае Беларусі магчымасць нівеліраваць заходнюю блакаду, паколькі на пляцоўцы ШАС вырашаюцца стратэгічныя пытанні глабальнага развіцця. Гэта магчымасць удзелу ў развіцці буйных транзітных калідораў, будаўніцтва інфраструктуры, увасаблення маштабных праграм.

Для Беларусі гэта тое, што мы называем «разваротам на Усход». Гэты кірунак надзвычай перспектыўны. Тым больш калі ў рамках ШАС пачалі рэалізоўвацца праекты, альтэрнатыўныя Захаду, якія ахопліваюць шмат дзяржаў. У нас ёсць талент займацца вялікай палітыкай, дарэчы, рэдкі для невялікай па памерах краіны. Пасля распаду СССР Беларусь некалькі разоў брала ўдзел у значных міжнародных ініцыятывах — ад рэформы Руху недалучэння да стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. З гэтым багажом заўважнасці ў вялікай дыпламатыі мы прыходзім у ШАС у якасці паўнаважкага члена. Гэта дае неабсяжныя вокны магчымасцяў. Як мы імі скарыстаемся, залежыць выключна ад нас.

**Гутарыў Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## ❍ У тэму

### Традыцыйныя сябры і ключавыя партнёры

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва для Беларусі — важная дыялогавая пляцоўка з традыцыйнымі сябрамі і ключавымі партнёрамі. Аб гэтым заявіў у БелТА першы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргей Алейнік. «Беларусь мае стратэгічны адносін з Расіяй і Кітаем. Разам з Расіяй, Казахстанам і Кыргызстанам уваходзіць у ЕАЭС, удзельнічае ў рэалізацыі кітайскай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Таджыкістан і Узбекістан з'яўляюцца нашымі важнымі гандлёва-эканамічнымі партнёрамі па Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Дынаміча развіваюцца адносіны з Індыяй і Пакістанам», — адзначыў першы намеснік кіраўніка беларускага МЗС.

Ён адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з 2016 года рэгулярна прысутнічае на пасяджэннях Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС і вылучае ініцыятывы, якія знаходзяць сваю падтрымку сярод краін-членаў. У розны час беларускі бок уносіў канкрэтныя прапановы па забеспячэнні харчовай бяспекі ў рамках ШАС, стварэнні спецыялізаванай экспазіцыі «АграШАС» на міжнародным форуме аграрыяў «Белагра», умацаванні ядзернай бяспекі і мірнага выкарыстання атама. Шырокія водгукі атрымалі нашы ініцыятывы па спалучэнні стратэгій развіцця краін арганізацыі, развіцці супрацоўніцтва ў галіне аховы здароўя, транспарту, аднаўляльных крыніц энергіі, выкарыстання ў гандлі і фінансах нацыянальных валют, барацьбы з кіберпагрозамі.

«Мы бачым, з якім моцным знешнім націскам, у першую чаргу з боку Захаду, сёння сутыкаюцца Расія і Кітайская Народная Рэспубліка, іншыя краіны арганізацыі. На гэтым фоне ў 2021 годзе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выступіў з ініцыятывай умацавання супрацоўніцтва ШАС і АДКБ», — адзначыў першы намеснік кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства. Ён таксама звярнуў увагу на цытату з віншавальнага паслання Аляксандра Лукашэнкі 15 чэрвеня 2022 года ў адрас генеральнага сакратара Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Міна: «На працягу ўсёй сваёй гісторыі ШАС уносіць важкі ўклад у стабільнае і паступальнае развіццё Еўразійскага рэгіёна. Сведчаннем узрослага аўтарытэту арганізацыі, у якой многія бачаць магчымасць рэалізаваць разнастайныя сумесныя праекты, з'яўляецца паслядоўнае пашырэнне яе граніц з уцягваннем новых удзельнікаў».

Сяргей Алейнік з упэўненасцю канстатаваў: «Умацаванне і пашырэнне ШАС набывае асаблівае значэнне ва ўмовах санкцыйнага супрацьстаяння, якое адчуваюць нашы краіны з боку Захаду. Арганізацыя аб'ядноўвае дзяржавы, якія накіраваны на развіццё шматпалярнага, раўнапраўнага і інклюзіўнага светаўладкавання і выступаюць супраць умяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, прымяненне падвойных стандартаў і неправамерных аднабаковых санкцый». Першы намеснік міністра замежных спраў падкрэсліў, што Беларусь падзяляе падыходы Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва да процідзеяння пратэкцыянізму і гандлёвым войнам, якія тармозяць сусветнае развіццё і маюць глыбокую эканамічную рэцэсію.

Займаючы стратэгічна важнае геаграфічнае становішча, Рэспубліка Беларусь здольна і гатова арганічна дапоўніць супрацоўніцтва ў рамках ШАС у сферах эканомікі і бяспекі, выкарыстоўваючы свой транзітны, прамысловы і навуковы патэнцыял, вопыт міратворчай дзейнасці і шматбаковай дыпламатыі.

Будзь у курсе!

# БРАТ МЕНШЫ ПАД КОЛАМІ

## Як пазбегнуць сутыкнення з дзікай жывёлай на аўтадарозе: парады ад Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету

**Дарожна-транспартныя здарэнні, прычынай якіх з'явіліся выхады дзікіх жывёл на праезную частку аўтамабільных дарог, — з'явы, на жаль, нярэдкія. Для дзікіх жывёл яны, як правіла, заканчваюцца гібеллю, а ў выпадках сутыкнення з буйнымі капытнымі (зубр, лось, высакародны алень, кабан, казуля) могуць мець вельмі негатыўныя наступствы для аўтамабіляў і, на жаль, для кіроўцаў і пасажыраў.**

На працягу першага паўгоддзя Дзяржаўнай інспекцыяй зарэгістравана 1470 фактаў ДТЗ з удзелам паляўнічых жывёл нармаваных відаў, у выніку якіх загінула 1496 жывёлін.

Па відавой структуры загінулых, як і ў мінулым годзе, у большасці выпадкаў фіксаваліся факты гібелі ў выніку ДТЗ казулі (1066 асобін, 71,2 працэнта ад агульнай колькасці жывёл) і лася (344 асобіны, 23 працэнты), што абумоўлена асаблівасцямі біялогіі (паводзін), а таксама больш высокай іх колькасцю (133 тысячы асобін казулі і 47 тысяч асобін лася) ва ўгоддзях у параўнанні з іншымі відамі дзікіх капытных жывёл. Акрамя таго, у выніку ДТЗ у першай палове бягучага года загінулі 33 асобіны высакароднага аленя (2,2 працэнта), 49 асобін дзіка (3,3 працэнта), а таксама чатыры бабры (0,3 працэнта).

У гэтым годзе адзначаецца зніжэнне колькасці фактаў ДТЗ з удзелам паляўнічых жывёл у параўнанні з 2021 годам на 11,8 працэнта, што можа быць звязана са зніжэннем аўтамабільнага трафіку на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах, а таксама больш суровымі ўмовамі зімы і зацяжной вясной.

Найбольш няўдалымі ў адносінах да ДТЗ з удзелам дзікіх капытных жывёл з'яўляюцца рэспубліканскія аўтамабільныя дарогі: М-6 (Е-30) Мінск — Гродна — граніца Рэспублікі Польшча (Брузгі), М-2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск, М-1 (Е-30) Брэст (Казловічы) — Мінск — граніца Расійскай Федэрацыі, М-4 Мінск — Магілёў, М-5 Мінск — Гомель, М-8 (Е-95) граніца Расійскай Федэрацыі (Езярышча) — Віцебск — Гомель — граніца Украіны (Новая Гута).



Дзікія жывёлы выходзяць на аўтадарогі па розных прычынах. Часцей за ўсё — пры сезонных зменах месцапражывання, а таксама ў пошуку месцаў кармлення. Некаторых дзікіх жывёл (як правіла, капытных) прыцягваюць раскіданыя дарожнымі арганізацыямі пясчана-салевыя сумесі, многія дзікія птушкі знаходзяць на абочынах дарог дробныя каменьчыкі, неабходныя для стрававання. Часам дзікія жывёлы выходзяць на асфальт проста пагрэцца і абсохнуць ад расы (зайцы, лісіцы і інш.), бо тэмпература асфальту звычайна вышэйшая за тэмпературу паветра. Нярэдка дзікія жывёлы выбягаюць на аўтадарогі, ратуючыся ад драпежнікаў ці паляўнічых сабак.

У большасці выпадкаў сутыкненняў з дзікай жывёлай можна пазбегнуць. Калі на шляху руху аўтамабіля або на абочыне аўтадарогі з'явілася дзікая жывёла, неабходна неадкладна зменшыць хуткасць да ўзроўню, калі можна імгненна спыніцца. Дзікія жывёлы не ў стане ацаніць хуткасць аўтамабіля, у выніку чаго можа адбыцца сутыкненне.

Таксама кіроўцам трэба памятаць, што дзікія жывёлы найбольш актыўныя ў цёмны час сутак, таму з надыходам змяркання трэба праяўляць павышаную пільнасць і выбіраць адпаведны хуткасны рэжым. Павышаную небяспеку ўяўляюць участкі аўтамабільных дарог з блізкаразмешчанай драўняна-хмызняковай расліннасцю.

Калі лось, алень, заяц ці іншая дзікая жывёла ў начны час апынаецца ў святле фар, то пужаецца ад асляплення: цемра за межамі святла ўспрымаецца як сцяна, і жывёла, як правіла, пачынае кідацца, не бачачы нічога, акрамя асветленага ўчастка дарогі і фар. У такой сітуацыі варта спыніцца, выключыць святло фар (але пакінуць уключанымі габарытныя агні), уключыць аварыйную светлавую сігналізацыю, тым самым даць жывёле час адаптавацца да цемры і пакінуць дарогу.

Захаванне Правілаў дарожнага руху, у тым ліку ўстаноўленага хуткаснага рэжыму, прыняцце кіроўцам адпаведных мер у зоне дзеяння папераджальнага знака «Дзікія жывёлы» дасць магчымасць пазбегнуць аварыйных сітуацый, звязаных з раптоўным з'яўленнем дзікіх жывёл на аўтамабільных дарогах.

Акрамя таго, нагадалі ў Дзяржінспекцыі, у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства, пры выяўленні грамадзянамі ва ўгоддзях, у тым ліку на дарогах, параненых, траўміраваных, хворых або загінулых дзікіх жывёл забараняецца самавольна здабываць іх, разбіраць або перамяшчаць (транспарціраваць) іх тушы або часткі туш, выкарыстоўваць прадукцыю (мяса, шкуру, рогі і інш.). Аб выяўленні тушы дзікай жывёлы неабходна паведаміць па тэлефоне 102.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта Дзяржінспекцыі.**

# ШПАЦЫР БЕЗ ЭКСТРЫМУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Вызначыўшы зону пошуку, мы прачэсвалі лес, працавалі ў водгук, — расказвае **намеснік начальніка Барысаўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Максім ЕРМАКОВІЧ.** — Пошукі працягваліся да самай раніцы. На наступны дзень аб'явілі збор асабовага складу гарнізона, да пошукаў таксама падключыліся супрацоўнікі пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада ўпраўлення, рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР», вайскоўцы, леснікі, валанцёры, мясцовыя жыхары — усяго было задзейнічана звыш 150 чалавек. Мы пашырылі зону пошуку: некаторыя месцы прачэсвалі па некалькі разоў, бо лес у гэтым раёне вельмі густы.

Позна вечарам супрацоўнікам МНС паступіла паведамленне ад РАУС аб тым, што адзін з рыбакоў чуе крык аб дапамозе. Усе, хто быў задзейнічаны ў пошуку, выехалі да ўказанага месца і пачалі прачэсваць узбярэжжа. Жанчыну знайшлі ў кустах каля ракі. Яна была ў аслабленым стане — амаль двое сутак знаходзілася ў лесе. Грамадзянку шпіталізавалі ва ўстанову аховы здароўя. Калі б у яе з сабой быў мабільны тэлефон, такіх наступстваў можна было б пазбегнуць — яе знайшлі б нашмат хутчэй.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Жыхарка Віцебскага раёна сама патэлефанавала ратавальнікам і паведаміла, што заблудзілася. Да месца, адкуль паступіў сігнал, неадкладна былі накіраваны найбліжэйшыя падраздзяленні Віцебскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Да моманту сустрэчы з пацярпелай ратавальнікі падтрымлівалі з ёй сувязь па тэлефоне. Ужо потым пенсіянерка расказала, што выйшла на адной са станцый і пайшла ў лес. Праз некаторы час яна зразумела, што не можа знайсці дарогу назад. Пасля ўстанаўлення сувязі з супрацоўнікамі МНС жанчына чакала, пакуль яе знойдуць. Пенсіянерка выразна пачула сігнал, які праз спецыяльнае ўстройства падалі ратавальнікі, і па камандзе пайшла на гук. Па дарозе яе сустрэў супрацоўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Жанчына знаходзілася ў нармальным фізічным стане, таму абышлося без аказання медыцынскай дапамогі.



Аблегчыў мабільны тэлефон і пошукі мужчыны ў Пухавіцкім раёне. Апошні сам патэлефанаваў ратавальнікам і паведаміў, што заблудзіўся. Да месца, адкуль паступіў сігнал, быў накіраваны асабовы склад пажарнага аварыйна-ратавальнага паста № 14 Пухавіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Да пошукаў таксама падключыліся супрацоўнікі лягсаса. Як расказаў **камандзір аддзялення ПАРП № 14 в. Арэшкавічы Пухавіцкага РАНС Міхаіл ВАРЫВОНЧЫК,** сувязь з грамадзянінам трымалі па мабільным тэлефоне. «Ён сарыентаваў нас, што зайшоў з боку садовага таварыства і ішоў уздоўж сцежкі, дзе на дрэвах віселі апазнавальныя знакі ў выглядзе нейкіх стужак, — удакладніў дэталі пошуку ратавальнік. — Зайшоўшы ў глыбіню лесу на адлегласці пяці кіламетраў, мы пачулі крык аб дапамозе таго, хто згубіўся».

### Што ўзяць з сабой і як апранацца?

На жаль, не ўсе падобныя гісторыя заканчваюцца хэпі-эндам. Цяпер увогуле пахаладала, а таму перспектыва заначаваць пад адкрытым небам пагражае сур'ёзнымі наступствамі.

Калі ж усё-такі накіраваліся ў лес, вазьміце з сабой невялікі запас ежы, ваду, нож і запалкі. Добра, калі вы пасняхова вернецеся дамоў. Калі ж заблукаеце, то гэты просты набор дазволіць нейкі час пратрымацца. Не забудзьцеся мабільны тэлефон (абавязкова зараджаны!), а таксама лекі, якія вам неабходна прымаць. Апранайцеся так, каб зверху быў хаця б адзін яркі элемент — гэта дапаможа прыцягнуць увагу. Адзенне і абутак павінны быць непрамакальнымі. І, самае галоўнае, праінфармуйце аб паходзе ў лес родных і блізкіх, каб у выпадку, калі не вернецеся, было каму забіць трывогу.

— Паважаныя дзеці пажылых бацькоў, пагутарыце са сваімі мамамі і татамі, устрымайце іх ад паходаў па грыбы або ягады, калі на гэта ёсць хоць нейкая перашкода: дрэннае самаадчуванне ці надвор'е, хранічныя захворванні, якія могуць шмат што змяніць за лічаныя хвіліны, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Сярод тых, хто губляецца ў лесе, большасць — пенсіянеры. Таму зварот, у першую чаргу, да вас, прадстаўнікі «залатога» ўзросту — не спадзявайцеся толькі на вопыт, выконвайце рэкамендацыі!

Звяртаюцца ратавальнікі і да тых, хто ў лесе бывае нячаста. Адпраўляцца туды варта толькі з тым, хто добра ведае мясцовасць, не трэба быць беструботнымі. Пакуль вас будуць шукаць, а пошукі заўсёды патрабуюць прыцягнення вялікай колькасці людзей, дзесьці яшчэ можа спатрэбіцца неадкладная дапамога ратавальнікаў. А лепш за ўсё ў «чужы» лес не хадзіць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

### Калі вы заблукалі ў лесе

— Не панікуйце, спыніцеся і падумайце, адкуль прыйшлі, ці не чуваць крыкаў, шуму машын, брахання сабакі, цягніка. Гэтыя гукі дапамогуць выйсці да людзей.

— Калі ўпэўнены, што вас будуць шукаць, заставайцеся на месцы, развядзіце вогнішча (у бяспечным месцы) — па дыме знайсці чалавека лягчэй.

— Паспрабуйце, калі ёсць такая магчымасць, выйсці на лінію электраперадачы, чыгунку, газаправод, раку: ідучы ўздоўж гэтых аб'ектаў, заўсёды выйдзеце да людзей, няхай і не там, дзе меркавалі.

— Падавайце гукавыя сігналы ўдарамі палкі аб дрэва: гук ад іх далёка разыходзіцца па лесе.

— Пакідайце па дарозе «засечкі»: надламаная галінка, страла, выкладзеная з камянёў, прывязаны да куста кавалак тканіны могуць паслужыць службу і вам, і тым, хто захоча дапамагчы.

— Калі ўсё ж ноч заспела ў лесе, падбярыце прыдатнае месца для начлегу. Рухацца ў цёмны час не рэкамендуецца: можна атрымаць траўму, спатыкнуўшыся або праваліўшыся ў ваду. Месца для начлегу выбірайце высокае і сухое, пажадана каля вялікага дрэва. Нарыхтуйце галлё для вогнішча. Размясціцца лепш за ўсё спінай да дрэва, перад сабой распаліце агонь і падтрымлівайце яго ўсю ноч.

Захаванне гэтых нескладаных рэкамендацый дапаможа вам, здзяйсняючы шпацыр у лес, не трапіць у экстрэмальную сітуацыю або выйсці з яе максімальна хутка і камфортна.

# НАВАТ МЕТАЛ НЕ ВЫТРЫМЛІВАЎ...

## На вышыні 215,5, што ў Горацкім раёне Магілёўшчыны, па-геройску праявіла сябе польская дывізія

**У аграгарадку Леніна Горацкага раёна знаходзіцца вялікае пахаванне часоў вайны байцам 1-й польскай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, якая гераічна абараняла ад фашыстаў беларускія землі і амаль цалкам палягла ў бітве за вышыню. Гэта месца знаходзіцца пад аховай дзяржавы і за ім наладжаны пастаянны догляд. Вось і цяпер тут рыхтуюцца да сустрэчы гасцей, якая адбудзецца 12 кастрычніка. Менавіта ў гэты дзень у 1943 годзе 1-я польская пяхотная дывізія дапамагала Чырвонай Арміі вызваляць Беларусь. У 1968 годзе па ініцыятыве савецкай дзяржавы подзвіг палякаў быў увекавечаны ў мемарыяле. З тых часоў штогод у кастрычніку тут адбываюцца ўрачыстасці з удзелам прадстаўнікоў польскага боку. Спачатку гэта былі ветэраны, потым іх нашчадкі. І сувязь не перарываецца.**



— Да нас едуць польскія турысты і групамі, і ў індывідуальным парадку на экскурсію, — расказвае **загадчыца музея савецка-польскай баявой садружнасці Таццяна РЫНКЕВІЧ**. — Не так даўно да нас прыязджаў сын удзельніка бітвы Мікалая Яўсейчыка. Мікалай прыняў тут сваё баявое хрышчэнне і дайшоў да Берліна. Яго сын жыве непадалёк ад Любліна і прыязджаў да нас не ўпершыню. У свой час ён перадаў музею ўзнагароды бацькі і дакументы. Сказаў, што гэта была яго просьба. Частка экспанатаў знаходзіцца сёння ў музейнай экспазіцыі. Сын, калі прыязджае сюды, доўга стаіць каля гэтай вітрыны і заўсёды фатаграфуецца на яе фоне. Сёлета ён прывёз нам юбілейныя медалі ў гонар польскай дывізіі і бітвы пад Ленінам, а таксама дакументы. Спытаўся, ці змесцім іх у нашай экспазіцыі. Відаць, што для яго гэта вельмі важна. Нездарма ж чалавека цягне сюды як магнітам. Калі была пандэмія, і граніцы былі зачыненыя, ён слаў лісты ў інтэрнэце. А яшчэ ўвесь час віншуе нас са святамі — Вялікаднем, Новым годам.

На тэрыторыі аграгарадка цэлы комплекс аб'ектаў, звязаных з бітвай. Таццяна Рынкевіч звяртае ўвагу на брацкае пахаванне савецкіх салдат у цэнтры населенага пункта. Гэта каменная зорка, з якой, па сутнасці, і пачынаецца шлях памяці, які звычайна праходзяць удзельнікі сустрэчы падчас памятнай даты. Адсюль пяць хвілін хады да пахавання польскіх салдат. Вакол вялікі парк, збоку нясе свае воды рэчка Мерэя. Чыста, дагледжана, як на любым іншым воінскім пахаванні. Вунь і ахоўная шыльда аб тым, што мемарыял знаходзіцца пад абаронай дзяржавы. Значыць, тут рыхтуюцца да сустрэчы гасцей, робяць невялікі рамонт помнікаў. Палякі, як правіла, прывозяць кветкі і вянкі, якія ўскладаюць на магільныя пліты.

— 12 кастрычніка 1943 года адсюль пачаўся першы бой 1-й польскай дывізіі, — расказвае Таццяна Рынкевіч. — За два дні баёў тут загінула 1711 савецкіх салдат і афіцэраў і 502 палякі. Шмат было раненых, якія зніклі без вестак.

На плітах, акрамя загінулых, увекавечаны імёны тых, хто знік без вестак, і тых, хто памёр ад ран, — усяго 546 воінаў. 14 кастрычніка 1943 года дывізія, дакладней, тое, што ад яе засталося, была выведзена ў тыл, а яе месца заняло іншае фарміраванне. Потым гэта ж дывізія ваявала на тэрыторыі Украіны, вызваляла Варшаву.

Дарэчы, першапачаткова на месцы польскага пахавання быў проста помнік, пліты з імёнамі воінаў з'явіліся пазней і былі ўстаноўлены за грошы польскіх ветэранаў.



Каля галоўнай кампазіцыі ў гонар польскай дывізіі стаяць помнік з зоркай Давіда, праваслаўны і каталіцкі крыжы. Мая гід звяртае ўвагу на тое, што людзі розных канфесій аб'ядналіся для барацьбы з варожай сілай.

З месца пахавання польскай дывізіі адкрываецца від на музей савецка-польскай баявой садружнасці, які стаіць на ўзгорку. Гэта і ёсць тая вышыня 215,5, якую 12 кастрычніка 79 гадоў таму штурмавалі палякі.

Мы падымаемся на тую калісьці непрыступную вышыню па вуліцы Анэлі Кжывонь — 18-гадовая дзяўчына пасмертна атрымала званне Героя Савецкага Саюза. У армію яна прыйшла добраахвотніцай, была аўтаматчыцай. Падчас бою атрымала заданне адвезці ў штаб сакрэтныя дакументы, а заадно даставіць у шпіталь параненых. Але нямецкі лётчык убачыў машыну, якая рухалася ад лініі бою ў бок лесу і адкрыў агонь. Аўто ўспыхнула, але Анэля магла пазбегнуць смерці, але яна кінулася выцягваць з машыны параненых. І калі вярнулася па апошняга, аўтамабіль узарваўся...

У музейнай экспазіцыі гэтай дзяўчыне адведзена пачэснае месца, як і яе польскім таварышам па дывізіі — капітанам Уладзіславу Высоцкаму і Юліушу Гюбнеру, якія за свае подзвігі таксама атрымалі званні Герояў Савецкага Саюза.

У аграгарадку ёсць вуліцы, названыя ў гонар і герояў-чырвонаармейцаў. Маёр Пятроў асабістым прыкладам падняў байцоў свайго падраздзялення ў атаку. Яшчэ адна вуліца названа ў гонар разведчыка Дзмітрыя Юркова.

Баі за вышыню былі вельмі цяжкія. Палякі наступалі па пойме рэчкі, якая на той час была болей паўнаводная і разлівалася падчас восеньскіх дажджоў. Поле ператварылася ў балоцістую мясцовасць і ўяўляла сур'ёзную перашкоду для тых, хто наступаў. Побач з музеем ёсць яшчэ адно пахаванне, дзе ляжаць невядомыя савецкія і польскія воіны. Над ім высіцца абеліск, які нагадвае пакарабачаны браніраваны метал з дзіркамі. Называецца ён «Прабітая браня» — у сімвал таго, што нават метал не вытрымліваў тое, што прыходзілася перажываць чалавеку. Пасярод брацкага пахавання — месца для Вечнага агню, які запальваецца падчас жалобных мітынгаў. Па баках сцяжкі ляжаць гранітныя пліты: злева — у гонар памяці невядомых польскіх воінаў, справа — савецкіх. І гэтае месца смутку таксама дагледжана.

— Самі прыбіраем, дапамагаюць моладзь, грамадства, — звяртае ўвагу Таццяна Рынкевіч. — Грошы на рамонт выдзяляюцца па лініі бюджэту.

Музей савецка-польскай садружнасці не падобны на іншыя. Ён круглай формы і нагадвае каску салдата. З яго вокнаў добра праглядаецца ўся панарама, дзе адбываліся баявыя дзеянні. Музей, дарэчы, працуе як гарадскі — шэсць дзён на тыдзень. Квіток каштуе рубель для студэнтаў, два — для дарослых. З экскурсіяй даражэй.

У экспазіцыі прасочваецца ўвесь шлях польскай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі ад пачатку да канца.

Дывізія фарміравалася пад Разанню і прыбыла на месца сваёй дыслакацыі 10 кастрычніка. Моманты праходжання вучэнняў у лагерах і адпраўкі на баявыя пазіцыі зафіксаваны на фота. Пад шклом дакументы, узнагароды, нават газетная старонка на польскай мове фарматам А2. Яна датавана 24 кастрычніка 1943 года.

Пачэснае месца займае дырама «Бой пад Ленінам», на якой мастакі адлюстравалі самыя знакавыя моманты. Вунь маёр Пятроў у крытычны момант асабістым прыкладам падымае і вядзе байцоў у атаку, каб падтрымаць падраздзяленне капітана Высоцкага. А клубы дыму на ўскрайку лесу — гэта гарыць аўтамабіль гераічнай Анэлі.

На вялікіх плітах, што размешчаны на сцяне, у алфавітным парадку прозвішчы воінаў. Таццяна Рынкевіч расказвае, што сярод іх некаторыя наведвальнікі знаходзяць імёны сваіх продкаў.

Тыя крывавыя баі не былі лёгкімі для польскай дывізіі. Вораг упарта супраціўляўся, на вызваленцаў сыпаўся стальны град з зямлі і неба. Нямецкую артылерыю падтрымлівала магутная групоўка самалётаў. Пазіцыі пераходзілі ад аднаго боку да другога, месцамі даходзіла да рукапашнай. Польская дывізія змагла паглыбіцца толькі на 2,5 кіламетра, прарваўшы дзве нямецкія абароны з трох. Апошняй стала вёска Трыгубава, якая пасля атрымала сімвалічную назву Касцюшкава.

У адной з вітрын можна ўбачыць адну з найвышэйшых узнагарод Польшчы — Крыж Грунвальда другой ступені. Ім палякі ўзнагародзілі пасёлак Леніна. А ў 2016 годзе польская дэлегацыя прывезла ў музей вялікі бюст палкоўніка Зігмунда Берлінга — камандзіра дывізіі.

У музеі захоўваецца парадная форма намесніка камандзіра Баляслава Кеневіча. А таксама плашч і фуражка двойчы Героя Савецкага Саюза маршала Івана Якубоўскага, які разам з Пятром Машэравым былі ганаровымі гасцямі на адкрыцці музея.

Наогул, тут вельмі добра адчуваецца дух тых ваенных падзей. І вельмі шмат гаворачых экспанатаў. Гэта сцягі савецкіх і польскіх часцей, узоры зброі і ваенная тэхнікі таго часу, прадметы рыштунку, асабістыя рэчы ўдзельнікаў баёў, шматлікія дакументы і фатаграфіі. А яшчэ — вымпелы, сувеніры, партрэты, у тым ліку ваеннага і палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай Тадэвуша Касцюшкі, імя якога насіла дывізія. Дэлегацыя з Гданьска прывезла макет карабля пад знакавым імем — Леніна, а польскія шахцёры перадалі вазу з вугалю. Работа ювелірная, калі ўлічваць, які гэта крохкі матэрыял. Майстры ж упрыгожылі яе мноствам дробных дэталяў.

На тэрыторыі Ленінскага сельсавета знаходзіцца таксама пахаванне яшчэ аднаго ўдзельніка той бітвы — французскага лётчыка эскадрыллі Нармандыя-Нёман Морыса Бона, які загінуў 13 кастрычніка 1943 года.

— Некалькі гадоў таму, — расказвае **намеснік старшыні Горацкага райвыканкама Ларыса КРЫВІЦКАЯ**, — да нас прыязджалі прадстаўнікі Цэнтральнага гістарычнага музея «Нармандыя-Нёман» у Маскве і пабывалі на магіле гэтага лётчыка ў вёсцы Стэфанава, Яна знаходзіцца побач з месцам пахавання нашых салдат і дагледжана. Госці былі прыемна здзіўлены і дзякавалі за такую ўвагу да памяці герояў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*аграгарадок Леніна.*
**Фота аўтара.**

Боегатоўнасць

# УМОЎНЫ ПРАЦІЎНІК ЗНІШЧАНЫ

## На палігоне «Брэсцкі» разыгралі тактычны эпізод практычных дзеянняў войскаў

**За адным з этапаў камандна-штабнога вучэння Узброеных Сіл Беларусі назіралі міністр абароны Віктар Хрэнін, міністр унутраных спраў Іван Кубракоў, міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім Сіняўскі, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль Лапо. Падчас тактычнага эпізоду на Брэсцкім палігоне прысутнічалі і замежныя ваенныя аташэ з 14 краін: Аўстрыі, Азербайджана, Балгарыі, Венгрыі, В'етнама, Германіі, Казахстана, Перу, Польшчы, Расіі, Сербіі, Сірыі, ЗША і Турцыі.**

На палігоне стварылі тактычную абстаноўку, максімальна набліжаную да баявой. Па легендзе, незаконныя ўзброеныя фарміраванні і так званыя атрады самаабароны захапілі частку тэрыторыі дзяржавы. Вайскоўцам трэба было выцесніць умоўнага саперніка і аднавіць тэрытарыяльную цэласнасць краіны. У вучэннях былі задзейнічаны байцы 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады, якія падтрымлівалі танкавыя, супрацьтанкавыя падраздзяленні і падраздзяленні рэактыўнай артылерыі, сродкі супрацьпаветранай абароны і разлікі беспілотных авіяцыйных комплексаў.

У прыватнасці, быў разыграны эпізод паветранага бою. Падтрымку дэсантнікам забяспечылі знішчальнікі Су-30СМ, якія ўступілі ў блізкі манеўраны бой з сапернікам. Падтрымку тактычнай групе аказала штурмавая авіяцыя. Удар па пазіцыях умоўнага ворага нанеслі самалёты Як-130. Задача ў лётчыкаў была няпростая, таму што побач з раёнам вучэнняў знаходзіцца дзяржаўная граніца. Гэта патрабуе ад пілотаў асаблівай дакладнасці вытрымлівання зададзеных маршрутаў і вядзення арыенціроўкі ў ходзе пошуку і знішчэння зададзеных мэт. Таксама для разведкі з паветра выкарыстоўваліся беспілотнікі. Агонь па пазіцыях саперніка наносіла рэактыўная і ствольная артылерыя. Для прыгнечання сіл ворага задзейнічалі танкі, у тым ліку мадэрнізаваныя Т-72.

Адпрацавалі вайскоўцы і эпізод выратавання параненага экіпажа БТР-80. Пацярпелым трэба было аказаць першую медыцынскую дапамогу і эвакуіраваць іх. Пашкоджаную тэхніку таксама вывелі з поля бою. Заключным эпізодам на палігоне стаў штурм населенага пункта і вызваленне адтуль саперніка.

**Паводле БелТА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 410/С-18515 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад овощной), общей площадью 605,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Жолудева, 86.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 420850100001011300, площадью 0,3607 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания склада овощного), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Жолудева, 86. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, код – 2.7, площадью 0,3607 га; земли, расположенные в прибрежных зонах рек и водоемов, код – 2.5, площадью 0,3456 га; земли, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0151 га

Начальная цена продажи – 7 890 руб. (семь тысяч восемьсот девяносто рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 789 руб. (семьсот восемьдесят девять рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Волковысский филиал), 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 208, тел. 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 28 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукцион было размещено в газете «Звязда» от 06.10.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 26 сентября 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**

---

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Табаквинторг»** (продавец) извещает о проведении **27 сентября 2022 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение.
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109.
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду

**Начальная цена продажи с учетом НДС: 1 095 500,00** бел. руб.
**Задаток (3 %) с учетом НДС: 32 865,00** бел. руб.

**Дополнительные условия:** заключены договоры аренды: РУП «Фармация» действует до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2023 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.2022 г.; ООО «Тимоша бел» – до 11.04.2025 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2022 г., ООО «ЕВРОТОРГ» – до 27.04 2027 г.

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Конт. тел.: 25-26-46; +375 44 599-02-90.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений заканчивается 26.09.2022 г. в 16.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплатить предмет торгов в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

---

Идентификационную пластиковую карточку № АВ 0022044 риэлтера по операциям с недвижимостью ООО «Группа компаний Мариэлт» Дьяченко Дмитрия Евгеньевича **считать недействительной в связи с утерей.**

УНП 193601325

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех), общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,3377 га по адресу г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж.
Начальная цена продажи лота – 4 284 руб. (четыре тысячи двести восемьдесят четыре рубля) с учетом НДС.
Сумма задатка – 428 руб. (четыреста двадцать восемь рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 09.02.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 27 сентября 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion**

---

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 19 октября 2022 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объектов недвижимости – здания универмага и здания котельной универмага, принадлежащих Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности

**Лот № 1**

**Здание универмага, инв. № 334/С-1965.** Назначение: здание специализированное розничной торговли. Двухэтажное кирпичное здание, 1963 года постройки. Общая площадь 2 790,4 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка, подвал.
**Здание котельной универмага, инв. № 334/С-1963.** Назначение: здание специализированное коммунального хозяйства. Одноэтажное кирпичное здание, 1976 года постройки. Общая площадь 57,0 кв. м. Составные части и принадлежности: труба дымовая.
**Адрес объектов:** Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Ленина, 2.
**Здания обременены ипотекой в обеспечение исполнения обязательств по кредитному договору сроком по 03.08.2023 г. Согласие залогодержателя на продажу объектов имеется**

**Начальная цена лота: 852 000,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
**Задаток: 52 000,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

**Земельный участок** для обслуживания зданий на праве постоянного пользования площадью **0,4618 га** с кадастровым номером **322855100002002683.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 17 октября 2022 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **19 октября 2022 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением «О порядке организации и проведения аукционов», утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 14.09.2022 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1,5 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47.**
**сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: Лельчицкий филиал Гомельского облпотребобщества, Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 64, тел.: 8 (02356) 2-03-08, 2-07-70, 8 (029) 140-80-66.**

---

Извещение о проведении 14.10.2022 торгов ООО «СЕВДА»

**Ликвидатор ООО «СЕВДА»**
**индивидуальный предприниматель Кейдюк Л.В.**,
организатор торгов по продаже недвижимого имущества
**ООО «СЕВДА»** (УНП 590877744),
объявляет о проведении **14.10.2022 г. в 09.00** публичных торгов.

**Недвижимое имущество – предмет торгов публично размещен по ссылке:**
**kyfror.by**

Местонахождение имущества:
**капитальное строение с инв. № 400/С-143929,**
назначение –

## ЗДАНИЕ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЕ

**площадью 1911,4 кв. м,**
**расположенное на земельном участке 422000000009009845 по адресу: Гродненская область, Гродненский район, М-6, 289-й км, 4/1.**

Рыночная стоимость объекта оценки УП «Гродненское отделение БТПП» (без учета НДС) 1 736 000 бел. руб. или 694 177,86 доллара США.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375297868588.

Продавец и организатор торгов: Ликвидатор ООО «СЕВДА» индивидуальный предприниматель Кейдюк Лидия Владимировна, УПН 591108244, местонахождение: г. Гродно, ул. Рогачевского, 37, пом. 4, BY96MTBK30130001093300059003 в ЗАО «МТБАНК» БИКМТBKBY22, тел. +375298582356, grodnosbu@gmail.com

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **13.10.2022** на р/с BY96MTBK30130001093300059003 в ЗАО «МТБАНК» БИКМТBKBY22 получатель – ликвидатор ООО «СЕВДА» ИП Кейдюк Л.В. Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 14.09.2022** по **17.00 13.10.2022** – по адресу: г. Гродно, ул. Рогачевская, 37, пом. 4, grodnosbu@gmail.com.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение учредителя о продаже имущество по оценке УП «Гродненское отделение БТПП» и об участии в торгах.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Узденский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

## ЛОТ № 1: КОРОВНИК

*(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 623/С-60614 общей площадью 1579,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625600000001002802 площадью 1,2111 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, 14.**
*Земельный участок имеет ограничения в использовании: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, пл. 1,0208 га.*
Начальная цена с НДС (20 %) **– 64 008,96** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **6 400,00** бел. руб.

## ЛОТ № 2: СИЛОСНАЯ ЯМА,

**инв. № 623/С-60613 общей площадью 354,0 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625600000001002803 площадью 0,1269 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, в районе д. Сеножатки.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 11 831,04** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 183,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов, по лоту № 2 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **17.10.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.10.2022** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01718) 68-6-73, 8 (029) 936-28-18.**

УНП 600000330

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

14 верасня 2022 г. № 35 (671)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# Свята, якое нас яднае




## 17 верасня беларусы другі раз адзначаць самае маладое дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства

**Аб неабходнасці гэтага свята казалі даўно. Беларусам патрэбны быў дзень, які сімвалізуе яднанне беларускай нацыі, падзяліць якую спрабавалі на працягу ўсёй нашай гісторыі. І калі раней па розных прычынах гэта атрымлівалася, то падзеі сучаснасці прадэманстравалі, што ў XXI стагоддзі падзяліць, раз'яднаць, пасварыць беларускі народ немагчыма.**

**На VI Усебеларускім народным сходзе, які адбыўся ў лютым 2021 года, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Вячаслаў Даніловіч прапанаваў заснаваць Дзень народнага адзінства і выбраць паміж дзвюма датамі: 17 верасня і 14 лістапада. Тое, што яна будзе звязана з адной гістарычнай падзеяй — уз'яднаннем беларускага народа ў выніку вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе, — ніхто не сумняваўся.**

**Дату 14 лістапада грамадства не падтрымала (праводзілася адпаведнае галасаванне), хоць менавіта ў гэты дзень у далёкім 1939 годзе на пазачарговай сесіі Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР». Аднак не юрыдычнаму афармленню аб'яднання Беларусі аддалі перавагу сённяшнія грамадзяне краіны. У генетычнай памяці беларусаў больш яскрава адлюстравалася іншая дата — 17 верасня. У 1939 годзе ў гэты дзень пачалося аб'яднанне Заходняй Беларусі і БССР.**

**Спачатку, у канцы 1940-х гадоў, 17 верасня з'яўлялася асаблівым днём для беларусаў. У гонар гэтай даты называліся вуліцы, праводзіліся ўрачыстасці. Затым пра гэты дзень, а самае галоўнае, пра яго значэнне, як быццам забыліся — тагачасныя саюзныя кіраўнікі лічылі, што не варта нагадваць суседняй сацыялістычнай Польшчы аб не зусім прыемным для яе перыядзе гісторыі. Аднак чаму ва ўгоду камусьці мы павінны былі замоўчваць адметны факт сваёй гісторыі?!**

**Як падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прыйшоў час расставіць акцэнты ў мінулым для абароны будучыні. «Новы статус лёсавызначальнай для беларусаў даты — 17 верасня — стаў актам гістарычнай справядлівасці, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Гэтае свята заслужана стаіць нароўні з Днём Перамогі і Днём Незалежнасці. І гэта не проста даніна памяці, памяці ўз'яднання беларускага народа пасля двух дзесяцігоддзяў замежнай акупацыі. Мы ўвекавечылі сімвал, найважнейшы для разумення геапалітычных пагроз, якія і праз сотню гадоў не страчваюць сваёй актуальнасці».**

**У Год гістарычнай памяці Дзень народнага адзінства загучаў яшчэ больш яскрава. Наша гісторыя, памяць — менавіта тое, што яднае беларусаў, якія, нягледзячы на шматлікія выпрабаванні, здолелі захаваць сваю самабытнасць і самастойнасць.**

***Што дата 17 верасня азначае для гісторыі нашага народа і дзяржавы, чаму яе варта адзначаць і што рабіць, каб гэты дзень стаў сапраўдным святам у свядомасці людзей, мы распыталі членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, якія працуюць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.***

*(Працяг тэмы на стар. 2-3 «МС»).*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Адстойваць праўду і рабіць стаўку на моладзь

### Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з сенатарамі Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу ад Краснадарскага краю

**Парламентарыі дзвюх краін абмеркавалі супрацоўніцтва ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы, адукацыі, культуры. Закранулі і вялікую работу па захаванні гістарычнай памяці, якая праводзіцца на тэрыторыі як Беларусі, так і Расіі. Пагаварылі і аб ролі моладзі ў сучасным грамадстве.**

— Сёння Краснадарскі край і Беларусь звязваюць добрыя адносіны, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА**. — І не толькі ў плане эканомікі, хаця і эканоміка вельмі важная — у нас вырас тавараабарот. Поўдзень Расіі — жытніца. Нам гэта вельмі блізка. У нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі асаблівае стаўленне да сельскай гаспадаркі: вельмі шмат чаго зроблена і робіцца для падтрымкі аграпрамысловага комплексу нашай краіны.

Пры гэтым, што датычыцца супрацоўніцтва з Краснадарскім краем, па словах спікера верхняй палаты беларускага парламента, дасканаласць не мае межаў: можна ўдасканальвацца і працаваць абсалютна па ўсіх кірунках. У гэтай сувязі Наталля Качанава прывяла ў прыклад супрацоўніцтва Савета Федэрацыі і Савета Рэспублікі ў маладзёжнай сферы. Гэта і сумесны патрыятычны праект «Цягнік Памяці», і Маладзёжны савет, створаны пры Нацыянальным сходзе. «Мы будзем вельмі рады, калі наша моладзь будзе сябраваць, супрацоўнічаць, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — За моладдзю — будучыня, таму нам трэба прасоўваць гэты кірунак супрацоўніцтва. Са свайго боку мы будзем рабіць усё магчымае».

Наталля Качанава паведаміла, што парламентарыі дзвюх краін будуць адсочваць рэалізацыю 28 праграм, падпісаных на Вышэйшым дзяржаўным савеце Прэзідэнтамі Беларусі і Расіі. «Дэпутацкі корпус, сенатары — вельмі важны складнік супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты. — Мы будзем рабіць усё дзеля таго, каб разам супрацьстаяць тым выклікам, якія сёння ёсць у адносінах да нашых краін, — тое, што мы, уласна кажучы, робім заўсёды. Цяпер жа гэта трэба як ніколі. Мы павінны разам рабіць усё дзеля таго, каб адстойваць праўду ў адносінах да нашых краін. І супрацоўніцтва па розных кірунках дасць свае вынікі».

Як паведаміў **член Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па навуцы, адукацыі і культуры Уладзімір БЕКЕТАЎ**, шчыльныя адносіны з Беларуссю ў гэтага расійскага рэгіёна пачаліся яшчэ ў 1997 годзе, калі Аляксандр Лукашэнка з дэлегацыяй наведаў Краснадарскі край. «Мы намецілі шлях супрацоўніцтва, адкрылі сваё прадстаўніцтва ў Мінску, — заўважыў сенатар. — Мы зацікаўлены ў тым, каб у нас былі цёплыя, сяброўскія адносіны. Мы Саюзная дзяржава, а таму ў працэсе работы будуць з'яўляцца пытанні, якія будуць цікавіць Беларусь, народ вашай краіны, а таксама Расію, Краснадарскі край. У прыватнасці, у нас вельмі добры інстытут па вытворчасці насення пшаніцы, каласавых культур. Гэта для вас цікава. Развіваецца садаводства, вінаградарства. У сваю чаргу, у Краснадарскім краі, увогуле ў Расіі, запатрабавана прадукцыя беларускага машынабудавання. У перспектыве рэгіёны Расіі накіраваны на тое, каб больш шчыльна супрацоўнічаць з Рэспублікай Беларусь. Нам проста разам трэба працаваць. На гэта важна арыентавацца. У нас даўнія шчыльныя сувязі. Мы хочам, каб цёплыя, добрыя ўзаемаадносіны засталіся на доўгія гады наперад».

**Вераніка КАНЮТА.**

# СВЯТА, ЯКОЕ

## Адзінства дае народу шанц на будучыню

**Ігар ГЕДЗІЧ, член Савета Рэспублікі, дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра вызначыў галоўныя, на яго думку, аспекты Дня народнага адзінства**



### 17 ВЕРАСНЯ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

— Я ўспрымаю гэту дату як момант, што сімвалізуе гістарычную справядлівасць, што вярнулася на нашу зямлю. Менавіта 17 верасня 1939 года спынілася паланізацыя нашага насельніцтва. Хаця і зараз польская эліта падагравае свае амбіцыі па вяртанні былых земляў і ўтварэнні трэцяй так званай Рэчы Паспалітай. Бо інакш чым патлумачыць з'яўленне ў польскіх цягніках карты з новымі граніцамі, куды ўваходзяць беларускія Брэст, Гродна, украінскі Львоў? Мяркуючы па гэтым, польскія дзеячы не могуць прыняць факт нашай незалежнасці і выношваюць свае амбіцыйныя планы па далучэнні гэтых тэрыторый. Нездарма яны выступілі ў падтрымку тых санкцый, якія прыняў «калектыўны Захад».

Мне як сенатару даводзіцца часта сустракацца з моладдзю, праводзіць гутаркі. І магу канстатаваць, што многім маладым не хапае ведаў, нават аб тых жа падзеях 1939 года. І тут не трэба далёка хадзіць па прыклад. Мая бабуля расказвала, што ў яе вёсцы польская пані забараняла ім размаўляць на беларускай мове. Яны павінны былі гаварыць толькі па-польску. І ў краму заходзілі тады, калі там не было польскіх чыноў. Палітыка была скіравана на асіміляцыю, паланізацыю і ніяк інакш.

### ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ

У Гродне нямала знакавых аб'ектаў, звязаных з гэтай датай. Адна з вуліц носіць назву 17 верасня. Аб гістарычных падзеях сведчаць помнікі і вуліцы ў гонар тых, хто загінуў пры вызваленні горада ў 1939 годзе. Гэта як байцы Чырвонай Арміі, так і мясцовыя жыхары. Да таго ж значную ролю адыграла і падпольная барацьба на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Знакаміты Стары мост у Гродне быў адноўлены ў 1949 годзе да 10-годдзя гэтай памятнай даты. І вельмі важна, што яна вярнулася ў наша грамадскае жыццё і набыла статус дзяржаўнага свята. Раней мы неяк саромеліся гэтай даты, каб каго-небудзь не пакрыўдзіць. Беларусы, як вядома, народ талерантны. Але зараз час іншы. Мы выразна фарміруем свае гістарычныя арыенціры, адным з іх з'яўляецца дата 17 верасня, бо што можа быць важней для краіны, чым народнае адзінства?

### КРОК ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

Для нас сёння як ніколі важна быць адзінымі, згуртаванымі, разумець неабходнасць суверэнітэту дзяржавы. А ў яго аснове ляжыць у першую чаргу эканамічны складнік. Таму нам трэба працаваць, кожнаму займацца сваёй справай. Толькі на такім падмурку можна будаваць незалежную дзяржаву.

Мы даўно вядзём гаворку пра фарміраванне нацыянальнай ідэі. Мабыць, яна яшчэ не зусім саспела, гэта доўгі працэс. І тое, што вызначана канкрэтнае свята — Дзень народнага адзінства, — значны крок да развіцця той самай нацыянальнай ідэі. Тут ключавое паняцце — адзінства. Такі ж прынцып быў закладзены і 17 верасня 1939 года, калі дзве часткі Беларусі аб'ядналіся ў адну краіну. Гэты прынцып павінен развівацца і надалей. Цяпер мы рухаемся па ўзыходзячай. Па-першае, нам трэба ведаць сваю гісторыю, па-другое, не баяцца выказваць свае нарытывы. Бо няма чаго саромецца, наадварот, у беларусаў нямала падстаў для гонару. Аб гэтым варта заяўляць у поўны голас.

Ёсць свяшчэнныя сімвалы, якія ніколі не страцяць сваёй значнасці. Гэта Радзіма, сям'я, сяброўства. Я яшчэ дадаў бы: школа, праца, людзі навокал. І, вядома, гэта законы краіны, у першую чаргу Канстытуцыя. Гэта той базіс, які забяспечвае жыццяздольнасць грамадства і дзяржавы. Лічу, што зараз вельмі важна ўмацоўваць сямейныя каштоўнасці, берагчы сямейныя традыцыі, не паддавацца дэструктыўным плыням псеўдадэмакратычных тэхналагаў.

### ПАТРЫЯТЫЧНЫ РУХ

Зараз тэме адзінства ўдзяляецца вялікая ўвага, у краіне праходзіць шмат мерапрыемстваў да гэтай даты. Адбудзецца нямала дыялогавых пляцовак, у тым ліку ў Гродзенскай вобласці, на якіх якраз і будзем размаўляць з моладдзю на ўсе гэтыя тэмы. Трэба займацца папулярызацыяй нашых вехавых падзей, якія ў значнай ступені садзейнічалі фарміраванню сучаснага грамадства. Бо, калі мы самі не будзем аб гэтым казаць, людзі будуць шукаць інфармацыю ў іншых крыніцах, і не ўсе гэтыя крыніцы будуць праўдзівыя.

Сёлета Гродзенскі абласны драматычны тэатр зрабіў пастаноўку па п'есе Андрэя Макаёнка «Трыбунал». У нас ёсць даволі шырокі попыт на гэты спектакль сярод школьнікаў. Гэта такі сумесны праект з адукацыяй. Спектакль не страціў актуальнасці. Ён аб сапраўдным патрыятызме і з глыбокім падтэкстам, які прымушае задумацца аб сапраўдных каштоўнасцях грамадства.

## Галоўны абавязак — працаваць на карысць Радзімы

**Аляксандр КАРПІЦКІ, член Савета Рэспублікі, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы, доктар медыцынскіх навук**

— Свята, якое мы будзем адзначаць на гэтым тыдні, для нас новае, яно ўсяго другі раз, і толькі пачынае ўкараняцца ў жыццё, напаўняцца сэнсамі, традыцыямі, падзеямі — тым зместам, які паступова зробіць гэты дзень адметным. Свята народнага адзінства, несумненна, мае нашмат большы сэнс, чым проста дзень уз'яднання ўсходняй і заходняй частак Беларусі. Мы гаворым аб адзінстве нацыі, якое грунтуецца на агульнай гісторыі, менталітэце, звычках і традыцыях народа.

З усяго пералічанага і выбудоўваецца наша нацыянальная адметнасць, на якой узрастае адзінства. Нездарма ж складнікамі беларускага менталітэту заўсёды былі талерантнасць, спагада, гатоўнасць прыйсці на дапамогу. Беларуская талерантнасць — гэта ўжо свайго роду брэнд. На нашай зямлі спакон вякоў жылі людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Прычым жылі ў згодзе, разам працавалі, а беларусы ніколі не падкрэслівалі свае перавагі, не прыцiскалі іншых, наадварот, служылі прыкладам узаемапавагі і добрасуседства. Ну, а нконт спагады, умення спачуваць чужой бядзе наш народ можа быць нават узорам для іншых. Вось і цяпер мы прымаем украінскіх бежанцаў, і не проста прымаем — дапамагаем наладзіць жыццё, дапамагаем з работай, жыллём, прадстаўляем пэўныя сацыяльныя гарантыі.

Як і нашы продкі, мы шануем сваю гісторыю і людзей старэйшага пакалення. Калі сёлета, а таксама ў мінулым годзе ў якасці сенатара наведваў ветэранаў вайны, сустракаўся з малалетнімі вязнямі, меў магчымасць упэўніцца, што гэтых людзей не пакідаюць без увагі ўсе слаі грамадства. Шаноўныя ветэраны расказвалі аб сустрэчах са школьнікамі, моладдзю, прадстаўнікамі мясцовай улады. І гэта вельмі важна. Я таксама стараюся заўсёды зайсці ў школу, пагаварыць з вучнямі. І кожны раз адчуваю актуальнасць такіх сустрэч. Калі раслі мы, вакол яшчэ многа было ветэранаў, мы ведалі



Аляксандр КАРПІЦКІ з ветэранам вайны, франтавіком Вадзімам СІНЯКОМ з вёскі Камянюкі Камянецкага раёна.

пра вайну з першых вуснаў. Цяперашнія дзеці ведаюць пра яе з фільмаў, інтэрнэту, з кніг. Неабходна расказваць ім, тлумачыць, гутарыць на гэтыя тэмы. Не проста важна — архіважна тое, якія кнігі яны чытаюць, як успрымаюць інфармацыю. Гісторыя, агульнае мінулае, гонар за продкаў — тое, што здольна аб'яднаўваць нацыю.

Як і агульнае ўсведамленне адзінства правоў і абавязкаў грамадзяніна. Несумненным здабыткам нашай дзяржавы з'яўляецца даступнасць медыцынскага абслугоўвання. Любы чалавек з аддаленай вёскі, калі яму патрабуецца нават самае высокатэхналагічнае лячэнне, напрыклад, аперацыя, можа на яе разлічваць. Нашы школьнікі маюць магчымасць атрымаць добрую адукацыю незалежна ад даходу сям'і. А каб гэта ўсё і надалей працавала, умацоўвалася, мы павінны памятаць пра галоўны абавязак — працаваць на карысць Радзімы.

## РАЗАМ МЫ СПРАВІМСЯ З УСІМІ ЦЯЖКАСЦЯМІ

**Фелікс ЯШКОЎ, член Савета Рэспублікі, начальнік Гомельскай мытні**

— Дата 17 верасня ў нашай нацыянальнай гісторыі сапраўды вельмі знакавая. Яшчэ нядаўна для тых, хто нарадзіўся ў Савецкім Саюзе, прынцыпы міру, праўды і памяці аб Вялікай Айчыннай вайне былі непарушныя і відавочныя. Цяпер так званая заходняя цывілізацыя спрабуе прымусіць нас забыць сваю гісторыю іператварыцца ў людзей другога гатунку. Такое дапусціць нельга. Цаной намаганняў нашых продкаў, дзякуючы нашаму Прэзідэнту і працы беларускага народа сёння мы жывём у мірнай квітнеючай дзяржаве. «Мы, беларусы, мірныя людзі, сэрцам адданыя роднай зямлі» — словы нашага Дзяржаўнага гімна цалкам адлюстроўваюць сутнасць беларусаў. Тут няма чаго дадаць. Словы «Радзіма», «народ», «родны» аднакарэнныя і нясуць у сабе сімвалы сям'і, адзінства, узаемаразумення і ўзаемадапамогі. Усё гэта мы — беларусы — талерантны і міралюбівы народ, беражліва захоўвае гістарычную памяць, заснаваную на праўдзе і справядлівасці.

Святкуючы Дзень народнага адзінства, мы чарговы раз падкрэсліваем, што шануем і захоўваем традыцыйныя каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць



наш народ. Гэта перш за ўсё — жыць у міры і згодзе, працаваць, гадаваць і выхоўваць дзяцей... Для мяне асабіста Дзень народнага адзінства — сімвал таго, што мы ўсе разам, адзіным народам нашай краіны рухаемся па шляху цывілізаванага развіцця, разам пераадольваем цяжкасці, а часам і цяжкія гістарычныя падзеі, але аддаём свой голас за мір, росквіт і спакой у нашай краіне. Дзень народнага адзінства — вернасць традыцыям і маральным каштоўнасцям, любоў да Радзімы, адкрытасць і сумленнасць. Дзень народнага адзінства — гэта гонар за нашы дзяржаўныя сімвалы, якія так яскрава і дакладна раскрываюць гісторыю і адлюстроўваюць суверэнітэт беларускага народа.

Перакананы, што гэта дзяржаўнае свята абавязкова варта шырока адзначаць у працоўных калектывах, са сваёй сям'ёй, з сябрамі, дарагімі і блізкімі людзьмі. Бо калі будзе паразуменне і ўзаемапавага паміж усімі намі, тады і ў вялікай рэспубліканскай сям'і будзе парадак. Між тым святкаванне Дня народнага адзінства — стымул для ўмацавання грамадзянскай свядомасці і згуртаванасці, стымул аб'яднання людзей усіх пакаленняў. Бо толькі разам мы — надзейнае звяно ў ланцугу захавання гістарычнай памяці, недапушчэння прыніжэння гераізму і заслуг нашага народа. Толькі аб'яднаўшы намаганні, мы справімся з усімі цяжкасцямі.

# НАС ЯДНАЕ

## Мы, беларусы, адчуваем сябе як вялікая дружная сям'я

**Наталля ЯКУБІЦКАЯ, член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў**

— Дзень народнага адзінства — свята хоць і маладое, але вельмі значнае для беларусаў. Яно сапраўды аб'ядноўвае людзей. «У грамадстве адчуваецца згуртаванасць, агульнасць поглядаў і інтарэсаў. Для нас народнае адзінства — гэта ўсведамленне людзьмі сваёй роднасці. Мы, беларусы, адчуваем сябе як вялікая дружная сям'я. Мы стараемся захаваць свае традыцыі і прымножыць іх. Праяўляем памяркоўнасць, гасціннасць, міласэрнасць, разуменне. Шчыра імкнёмся да дабра. Народнае адзінства абавязвае нас жыць, не падзяляючы людзей па нацыянальнай, рэлігійнай ці іншых прыкметах.

Наталля Якубіцкая заўважыла, што беларусы ва ўсе часы імкнуліся жыць у міры і сяброўстве. Заўсёды з павагай ставіліся да ўсіх нацыянальнасцяў, рэлігій, культур. «І для нас гэта прыярытэт. Наш народ у ліку першых на постсавецкай прасторы стаў на шлях народнага адзінства.



Дзякуючы гэтаму курсу, вызначанаму нашым Прэзідэнтам, мы збераглі сваю краіну ад шматлікіх бед і ўзрушэнняў. Беларусаў аб'ядноўвае мудрасць, талерантнасць і прыязнасць», — адзначыла сенатар.

Наталя Якубіцкая заўважыла, што сёлета Дзень народнага адзінства асабліва сімвалічна адзначаецца ў Год гістарычнай памяці, бо агульная гістарычная памяць — гэта падмурак народнага адзінства. «Нам ёсць на чым будаваць нашу будучыню. А будучыню мы будуем на сваёй гісторыі, на памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Цяпер шмат што робіцца, каб захаваць гістарычную памяць. І мы не будзем спыняць гэтую работу, паколькі яна патрэбная ўсяму беларускаму народу», — сказала яна.

Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў адзначыла, што народнае адзінства — гэта еднасць розных пакаленняў беларусаў, згуртаванасць кожнай асобнай сям'і і ўсёй краіны ў цэлым. Таму Дзень народнага адзінства — свята не толькі дзяржаўнае, але і сямейнае. «У гэты дзень варта ўспомніць гісторыю не толькі сваёй краіны, але і сям'і. Мы стараемся нашу памяць і нашу гісторыю ашчадна перадаць маладому пакаленню. Таму што мы людзі ўдзячныя, мы памятаем. З намі побач заўсёды былі ветэраны, у нас заўсёды перад вачыма подзвіг нашага беларускага народа. Мы гартаем старонкі гісторыі і захоўваем гэтую памяць, перадаём яе нашым дзецям», — падкрэсліла Наталля Якубіцкая.

Яна прызналася, што свята сустрэне на працы — з раніцы ў яе запланавана правядзенне прамой лініі. Наталля Якубіцкая расказала, што спачатку выслухае праблемы грамадзян, пастараецца іх вырашыць, а затым далучыцца да ўсіх суайчыннікаў, хто святкуе Дзень народнага адзінства. Дарэчы, гэта таксама аб'ядноўвае. Яна звярнула ўвагу на яшчэ адзін выдатны спосаб аб'яднаць людзей — дыялогавыя пляцоўкі. Напярэдадні Дня народнага адзінства шэраг такіх сустрэч прайшлі у Мінскай вобласці. «Людзі былі вельмі задаволены, прызнаваліся, што ўсё прайшло на адным дыханні. Былі цікавыя спікеры, узнімаліся цікавыя тэмы, важныя для людзей. А гэта таксама аб'ядноўвае», — расказала Наталля Якубіцкая.

Сенатар павіншавала беларусаў з Днём народнага адзінства. Яна пажадала ўсім салідарнасці, разумення і яднання, што абавязкова дапаможа ў такі няпросты час.

# Нідзе ў свеце няма больш дружнай і гасціннай нацыі, чым беларусы

**Юрый ДЗЕРКАЧ, член Савета Рэспублікі, старшыня Віцебскага абласнога камітэта прафсаюзаў**



— Нялёгкія гістарычныя метамарфозы неаднойчы імкнуліся зламаць унутраную моц і стойкасць беларусаў: нашы землі былі ў складзе іншых дзяржаў, падчас шматлікіх войнаў беларускія тэрыторыі былі амаль сцёртыя з твару зямлі, але наш народ раз за разам, як фенікс, адраджаўся з небыцця. Было нялёгка, але толькі агульнымі намаганнямі і жаданнем быць самастойнымі мы перамаглі розныя сацыяльныя і эканамічныя няўдачы і сёння жывём у незалежнай і міралюбівай дзяржаве.

Мы не проста так кажам, што гатоўнасць дапамагчы і самаадданасць характарызуюць беларусаў. Незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання і сацыяльнага статусу кожны чалавек, які апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, атрымае дапамогу любога ўзроўню ад дзяржавы. Тут можна адчуваць сябе ў бяспецы, не баючыся грамадскага асуджэння і пагроз збоку.

Галоўнай каштоўнасцю, якая нас яднае, якую берагуць беларусы, з'яўляецца наша гістарычная памяць — даніна павагі гераічнага подзвігу нашых продкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, тое, што мы беражліва, як крышталь, перадаём нашым дзецям. Без мінулага не будзе будучыні, без горкага вопыту стагоддзяў мы не навучыліся б жыць у міры і згодзе не толькі ўнутры Беларусі, але і з краінамі свету. З мэтай захавання гістарычнай памяці народа рэгулярна абнаўляюцца і добраўпарадкоўваюцца воінскія мемарыялы, вядзецца актыўная пошукавая праца па вяртанні з небыцця імёнаў байцоў-вызваліцеляў. І зараз наша старажытная Полаччына стала першым пунктам рэспубліканскага аўтапрабегу «Сімвал адзінства».

Да Дня народнага адзінства ў паўночным рэгіёне праходзіць шэраг мерапрыемстваў рознага кірунку, але галоўнай мэтай усіх з'яўляецца аб'яднанне: грамадскіх арганізацый і органаў кіравання, моладзі і сталага пакалення, палітыкі і культуры. У Віцебскай абласной філармоніі прайшоў патрыятычны марафон «У адзінстве — сіла Беларусі», Наваполацк прымаў удзельнікаў круглага стала, а ў суботу там жа прадстаўнікоў працоўнай моладзі збярэ патрыятычны фестываль. Менавіта з Наваполацка стартаваў абласны грамадзянска-патрыятычны марафон «Адзіны», удзельнікі якога перадаюць эстафету памяці ад раёна да раёна. У горадзе Глыбокае Дзень народнага адзінства пройдзе ў сінтэзе з абласным фестывалем працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2022» — яшчэ адзін паказчык высокага працоўнага выніку кожнага аграрыя, за якім стаіць харчовая бяспека ўсіх нас. У Докшыцкім раёне 16 верасня будзе закладзена алея Адзінства на месцы спаленай у гады вайны вёскі Баравыя. Полачына запрашае жыхароў і гасцей на ўрачыстае адкрыццё пляцоўкі тэхнікі і Узброеных Сіл СССР і Рэспублікі Беларусь. Яшчэ адной слаўнай традыцыяй Віцебшчыны з'яўляецца прысваенне ўстановам адукацыі імён Герояў Савецкага Саюза і выдатных дзеячаў Вялікай Айчыннай вайны. Напярэдадні свята яслі-саду № 24 горада Полацка будзе прысвоена ганаровае імя Паліны Сяргееўны Партновай, якая ў пачатку вайны выратавала мясцовых дзяцей-сірот.

Свята, якое адзначаецца 17 верасня, яшчэ раз нагадвае кожнаму беларусу незалежна ад месца пражывання аб сваіх каранях, аб вытоках, адкуль пайшлі ўсе мы — моцныя духам, гатовыя дапамагчы і гасцінныя. Апошняе, дарэчы, з'яўляецца нацыянальнай адметнасцю, якая не стварылася штучна, — так было закладзена на эмацыянальным узроўні здаўна. Наша прыгожая зямля заўсёды прыцягвала да нас замежных гасцей, а мы робім усё магчымае, каб у кожнага, хто наведае нашу краіну, заставаліся яркія эмоцыі і жаданне вярнуцца.

Устанаўленне Дня народнага адзінства як дзяржаўнага свята яшчэ раз падкрэслівае пераемнасць пакаленняў, непахіснасць і самадастатковасць беларускай нацыі і дзяржаўнасці.

# БЕЛАРУСАЎ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ СПАГАДЛІВАСЦЬ І ДАБРЫНЯ

**Ігар КАСКО, член Савета Рэспублікі, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы**

— Дзякуючы менавіта нашаму адзінству ў Беларусі, медыцына адна з найлепшых у свеце. Я ўрач і магу прывесці рэальны прыклад, які будзе ўсім зразумелы. Калі адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС, у Магілёўскай і Гомельскай абласцях былі адкрытыя анкагематалагічныя аддзяленні, каб папярэдзіць магчымы рост анказахворванняў. Яны працуюць пад эгідай нашага рэспубліканскага цэнтра. І не толькі. Уся гэта структура яшчэ і цесна супрацоўнічае з расійскім гематалагічным дзіцячым цэнтрам, мы ажыццяўляем сумесныя праекты ў лячэнні раку крыві ў дзяцей, захворванняў лімфоіднай тканкі. І сёння, распрацоўваючы разам з расіянамі пратаколы лячэння па хіміятэрапіі, прамянёвай тэрапіі, па некаторых відах захворванняў, такіх, напрыклад, як рак крыві, мы навучыліся захоўваць дзіцячыя жыцці ўжо ў 80 % выпадкаў. Яшчэ 30 гадоў таму выжывала толькі 10 %. Нездарма кажуць: адна галава добра, а некалькі — яшчэ лепш. Усё ў рэшце рэшт рэалізоўваецца ў вынік. А што галоўнае ў жыцці медыка? Вынік!

Ігар Каско звяртае ўвагу на тое, што ў Беларусі вельмі нізкая дзіцячая смяротнасць.

— У нас найлепшыя паказчыкі дзейнасці медыцыны ў сусветным маштабе, — падкрэслівае ён. — Дзіцячая смяротнасць складае ўсяго 2 праміле. Такіх краін у свеце няшмат. Пры гэтым мы не валодаем вялікімі рэсурсамі, якія можам лёгка ўкідваць у сістэму аховы здароўя. Наш вынік — сумесная работа ўсіх медыкаў, педагогаў, сістэмы сацыяльнай абароны. Калі структура працуе згуртавана, заўсёды ёсць станоўчы вынік.

Сенатар лічыць, што Дзень народнага адзінства вельмі арганічна спалучаецца з Годам гістарычнай памяці.

— Уся гісторыя вучыць любую дзяржаву і яе народ толькі аднаму: калі ён раз'ядноўваецца і дзеліцца на нейкія там групоўкі, то ўсё для краіны і для народа заканчваецца сумна. Гэта як у сям'і: калі ў ёй няма ладу, яна, як правіла, развальваецца. Калі мы нацэлены развівацца, павінны быць толькі разам. І свята Дзень народнага адзінства яшчэ раз нагадвае нам пра гэта, — кажа ён.

Сіла беларусаў у іх памяркоўнасці і спагадлівасці, лічыць суразмоўца.

— Беларусы заўсёды стараюцца дапамагчы адно аднаму, — падкрэслівае ён. — Я, працуючы ў абласной дзіцячай бальніцы, бачу гэта кожны дзень. У нас маса праектаў, якія эфектыўна працуюць. У Магілёве падхапілі ідэю рэспубліканскага анкагемацэнтра, дзе прыдумалі так званую скрыначку храбрасці. Гэта тэма была запушчана ў сацыяльнай сетцы старшай медсястрой анкагематалагічнага аддзялення. На фота, дарэчы, той самы момант, калі супрацоўнікі Белаграпрамбанка і Камітэта прафсаюзаў Магілёўскага аблвыканкама далучыліся да акцыі. Да 1 верасня яны прынеслі не толькі скрыначкі храбрасці, але і шыкоўную пасцельную бялізну. Мы стараемся стварыць для хворых дзетак хатнія ўмовы, каб у нас не пахла бальніцай, лекамі. Так, дзяржава шмат увагі аддае лячэнню дзяцей, у год на закупку лекаў для аднаго малога пацыента выдаткоўваецца амаль 1,5 мільёна еўра. А вось прыгожая пасцельная бялізна, тыя ж



**Прадстаўнікі Белаграпрамбанка і абкама прафсаюза Магілёўскага аблвыканкама прынеслі дзецям падарункі.**

цацкі — здаецца, дробязі, а насамрэч вельмі моцныя матыватары. Дзеці перасталі баяцца хадзіць у працэдурны кабінет: там жа цацку дадуць! Вось як гэта працуе. Аднаму чалавеку зрабіць такое не па сілах, а вось разам становіцца магчыма. У бальніцы ёсць дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, якіх забралі з праблемных сем'яў. Пра іх клапоцяцца іншыя людзі, якія вязуць ім падарункі, сродкі гігіены.

Дапамогу дзецям да 1 верасня прывезлі і супрацоўнікі атрада міліцыі асобага прызначэння.

— Мала хто ведае, што ў гэтым аддзяленні ёсць традыцыя: супрацоўнікі, якім былі нанесены траўмы і калецтвы падчас выканання службовых абавязкаў і яны па суду атрымалі права на маральную страту ад вінаватай асобы, аддаюць гэтыя грошы на дабрачынныя мэты. Яны аказваюць дапамогу розным сацыяльным установам. Сёлета гэтыя людзі прывезлі на ўвесь стацыянар мячы, шахматы, шашкі, настольныя і развіццёвыя гульні, шмат чаго іншага. Чым не прыклад адзінства са сваёй краінай і яе народам?

**Меркаванні сенатараў запісалі Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Валерыя СЦЯЦКО, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — УСТОЙЛІВАСЦЬ І РОСКВІТ

## Сенатары Таццяна Рунец і Кацярына Серафіновіч прынялі ўдзел у 14-м Саміце жанчын-спікераў парламентаў

**Саміт, які сёлета праходзіў з 8 да 9 верасня ў Ташкенце, аб'ядноўвае жанчын, якія займаюць вышэйшыя кіруючыя пасады ў парламентах. Удзельніцы саміту «Парламенцкае лідарства: прадбачачы рызыкі дзеля лепшага забеспячэння ўстойлівасці і росквіту» абмяняліся думкамі і вопытам па такіх актуальных пытаннях міжнароднага і нацыянальнага парадкаў дня, як ліквідацыя рызык у працэсе глабальнага аднаўлення пасля пандэміі, прадухіленне пагроз, звязаных з тэхналогіямі, абарона правоў чалавека і гендарнай роўнасці ў свеце тэхналогій і інш.**



— Азіраючыся назад, сёння можна ўпэўнена казаць аб тым, што пандэмія COVID-19 паказала нам, як яна здольна тармазіць глабальныя палітычныя працэсы і правакаваць новыя крызісы, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**. — З гонарам хачу адзначыць, што абраная Беларуссю мадэль рэагавання і падтрымкі ў пандэмію — без увядзення татальных забарон, лакдаўнаў і каранцінных мер — даказала сваю эфектыўнасць. Устойлівае ж аднаўленне пасля пандэміі будзе ў значнай ступені залежаць ад міжнароднага супрацоўніцтва і салідарнасці дзяржаў, і ў першую чаргу ад наяўнасці справядлівай, адкрытай і празрыстай гандлёвай сістэмы без эканамічных санкцый, ціску і ўмяшання ва ўнутраныя справы.

Па словах **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Кацярыны СЕРАФІНОВІЧ**, пандэмія каранавіруса прымусіла ўвесь свет усвядоміць важнасць працэсаў лічбавізацыі і пачаць у паскораным рэжыме перабудоўваць жыццядзейнасць чалавека на новы лічбавы ўклад. «У сучасных рэаліях інтэрнэт з'яўляецца найважнейшым элементам жыцця, — лічыць парламентарый. — Разам з тым яго імклівае развіццё дае шырокія магчымасці як для прагрэсу, так і адначасова для выкарыстання тэхналогій у злачынных мэтах. Менавіта гэты факт стаіць за ўсплёскам так званых інфармацыйных і гібрыдных войнаў, кампаній па дэзінфармацыі і распальванні нянавісці. Сёння наспела вострая неабходнасць у выпрацоўцы дакладнай міжнароднай прававой базы ў сферы інфармацыйнай бяспекі. Яе стварэнне будзе садзейнічаць у тым ліку эфектыўнаму супрацьдзеянню дэзінфармацыі і распальванню нянавісці ў інтэрнэце і афлайн».

14-ы Саміт жанчын-спікераў парламентаў праводзіўся ў дзясятую гадавіну Плана дзеянняў Міжпарламенцкага саюза для парламентаў, якія ўлічваюць гендарныя аспекты. Спецыяльны сегмент мерапрыемства даў магчымасць пераважаць аб тым, ці пачалі парламенты ўлічваць гендарныя аспекты больш, ці сталі яны больш інклюзіўнымі, эфектыўнымі і моцнымі інстытутамі, якія могуць забяспечваць устойлівасць і росквіт для ўсіх.

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ Даслоўна

«З гонарам хачу адзначыць, што ў Беларусі роля і значэнне жанчын нязменна расце. Мы ўваходзім у 27 краін свету, якія дасягнулі мэтавага паказчыка па ўдзеле жанчын у прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў. У гендарнай структуры дзяржаўных служачых, гэта значыць людзей, якія вызначаюць сучаснае аблічча Беларусі, фарміруюць умовы для росту эканомікі і развіцця сацыяльнай сферы, удзельная вага жанчын перавышае 70 працэнтаў, у тым ліку на кіраўніцкіх пасадах — каля 60 працэнтаў. У беларускім парламенце доля жанчын складае каля 35 працэнтаў. Для параўнання: сярэдні сусветны ўзровень прадстаўніцтва жанчын у замежных парламентах — 24,5 працэнта.

Прыведзеныя вышэй факты ў поўнай меры карэлююць з тым, што Беларусь падтрымлівае прапанаванае да абмеркавання сцвярджэнне: парламент, які ўлічвае гендарныя аспекты, можа праводзіць гендарна-адчувальную парламенцкую дыпламатыю, супрацоўніцтва ў мэтах развіцця і праводзіць мірную палітыку», — падкрэсліла Таццяна Рунец.

«Пытанні пашырэння правоў і магчымасцяў жанчын з'яўляюцца цэнтральнымі для працэсаў развіцця і забеспячэння стабільнасці дзяржавы. Менавіта таму мы, парламентарыі, канцэнтруемся на дзейсных заканадаўчых інструментах, якія ў кароткай доўгатэрміновай перспектыве забяспечаць роўны ўдзел жанчын у эканамічнай, грамадска-палітычнай і культурнай сферах», — адзначыла Кацярына Серафіновіч.

# «САЦЫЯЛЬНЫ КАНТРАКТ» І НЕ ТОЛЬКІ

## Падчас паездкі ў Ніжагародскую вобласць дэпутаты Гродзенскай вобласці абмеркавалі сістэму дапамогі маламаёмным сем'ям

**Гродзенская дэлегацыя на чале са старшынёй абласнога Савета дэпутатаў Аленай ПАСЮТАЙ сустрэлася з кіраўнікамі жаночых арганізацый і прадстаўніцамі Заканадаўчага сходу расійскай абласной адміністрацыі.**



Абодва бакі падзяліліся вопытам работы, якая датычыць інстытутаў сям'і і шлюбу. Напрыклад, беларускую дэлегацыю зацікавіла форма работы расіян у адносінах да крызісных сем'яў, у прыватнасці сацыяльны кантракт. Па словах Алены Пасюты, паміж сям'ёй і грамадскай арганізацыяй заключаецца пагадненне, у рамках якога членам сям'і аказваецца дапамога па адкрыцці сваёй справы, працаўладкаванні, адукацыі, а часам і псіхалагічная дапамога.

— Сацыяльны кантракт — гэта варты прыклад дапамогі сем'ям, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі і рэальная магчымасць вывесці такія сем'і за рамкі маламаёмных. Гэта дае магчымасць атрымліваць стабільны даход, адчуць упэўненасць у заўтрашнім дні. Абавязкова абмяркуем рэалізацыю такога пілотнага праекта ў сваім рэгіёне, — зазначыла Алена Пасюта. — Тым больш што падтрымка інстытута сям'і і мацярынства з'яўляецца прыярытэтным кірункам работы нашай краіны, які актыўна развіваецца з удзелам грамадскага аб'яднання Беларускага саюза жанчын.

Расійскія актывісткі, у сваю чаргу, маюць намер пераняць вопыт работы з маламаёмнымі і праблемнымі сем'ямі, якія стаяць на парозе пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Выклікала зацікаўленасць і паспяховае функцыянаванне дамоў сямейнага тыпу ў Беларусі, у прыватнасці ў Гродзенскай вобласці. Менавіта такая форма пражывання стала асноўнай для дзяцей-сірот і дзяцей, чые бацькі пазбаўлены правоў. Для такіх сем'яў будуюцца добраўпарадкаваныя катэджы, а колішнія інтэрнаты зачыняюцца.

Падчас сустрэчы абмеркаваны пытанні ролі жанчыны ў палітыцы і праблемы жанчын-прадпрымальніц, асабліва тых, якія пражываюць у сельскай мясцовасці. Былі акрэслены кірункі ўзаемадзеяння ў заканатворчасці і прынята рашэнне аб падпісанні пагадненняў паміж жаночымі грамадскімі арганізацыямі Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### ❍ У тэму

Ніжагародская вобласць — адзін з 24 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, з якім у Гродзенскай вобласці з 2005 года падпісана пагадненне аб гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. Тады ж быў падпісаны дагавор аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж беларускім Гродным і горадам Дзяржынскам Ніжагародскай вобласці. Як адзначалася падчас сустрэчы кіраўніцтва Беларусі і расійскага рэгіёна ў маі сёлетняга года, наша краіна займае вядучае месца ў міжнародным супрацоўніцтве Ніжагародскай вобласці. Было падкрэслена, што ўзровень таваразвароту сёлетнім маі дасягнуў 700 мільёнаў долараў. Мяркуецца, што сёлета гэты паказчык можа дайсці да 1 мільярда. Больш 20 пагадненняў дзейнічаюць у рамках адукацыйна-навуковага асяроддзя і ёсць перспектывы іх росту ў галіне IT-тэхналогій. У прыватнасці, расійскі бок разглядае пытанні ўдзелу беларускіх кампаній у сумесных праектах расійскіх грантаў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ
Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў):
zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 верасня 2022 года.

Журналіст даследуе праблему

# ПОБАЧ — НАЗАЎСЁДЫ

## «Лішнія» метры на могілках: правіла і выключэнне

**У рэдакцыю газеты прыйшло пісьмо ад жыхара Віцебска Мікалая Карповіча. Іх з сястрой маці была пахавана ў 1989 годзе на могілках у Мазурыне (прыгарад Віцебска). Па заканадаўстве таго часу, на адно пахаванне адводзілася пяць квадратных метраў, і, па словах Мікалая Якаўлевіча, дарослыя дзеці абгарадзілі бардзюрам адведзены даглядчыкамі кавалак зямлі. Праз 30 гадоў высветлілася, што замест адведзеных пяці метраў заняты 16,34 — уся свабодная зямля паміж дзвюма іншымі магіламі.**



Летась Мікалай з сястрой вырашылі замяніць стары помнік маці на новы, амаль за 700 рублёў ён быў выраблены ў лістападзе на прыватным прадпрыемстве, дзе знаходзіўся на захоўванні да вясны 2022 года. Калі брат з сятрой звярнуліся да даглядчыка могілак па дазвол замяніць надмагільную пліту, атрымалі адказ, што пакуль межы ўчастка не будуць пасунутыя ў адпаведнасці з нормамі, або пакуль не будуць зарэзерваваныя (гэта значыць, выкупленыя) «лішнія» метры, помнік ставіць не дазваляецца. Гэта было сказана Мікалаю Якаўлевічу вусна. Тады ён разам з сястрой звярнуўся ў Віцебскі гарвыканкам, на што кіраўніцтва горада пісьмова адказала: іх участак, абнесены бардзюрам у 90-я гады мінулага стагоддзя, складае 16,34 квадратных метра, што перабольшвае бясплатна адведзеную пад пахаванне зямлю на 11 з лішнім квадратаў. Рэзерваванне «лішніх» метраў на могілках у іх выпадку каштуе 1814, 4 рубля (пяць базавых велічынь за «квадрат»). У афіцыйным адказе гарвыканкама адзначана і тое, што адказны за Мазурынскія могілкі орган — Віцебскі спецыялізаваны камбінат грамадзянскага абслугоўвання — забарон на правядзенне работ па добраўпарадкаванні дадзенага ўчастка не выдаваў.

На спецкамбінаце пацвердзілі, што непасрэдна да іх кіраўніцтва з гэтым выпадкам ніхто не звяртаўся, а адказ горада складзены па нормах закона, гэта значыць, ён носіць хутчэй агульны, чым канкрэтны характар. Зараз на адзіночнае пахаванне бясплатна адводзіцца 2,5 квадратных метра, на двухмеснае — пяць квадратных метраў, тыя ўчасткі, якія не адпавядаюць гэтым памерам, павінны быць прыведзены ў парадак (маецца на ўвазе дэмантаж агароджы, якая захоплівае «лішнія» метры) або зарэзерваваны. Гэта працэдура ўяўляе сабой разавы плацёж без права на льготы, але пасля вынясення прадпісання, якое камбінат выдае пасля заявы на рэзерваванне, у грамадзян ёсць тры месяцы, каб сабраць неабходную суму.

Пахаванне 1989 года, пра якое спадар Карповіч напісаў у рэдакцыю, старое, і работнікі спецкамбіната прызналіся журналісту, што намеру зносіць усталяваныя 30 гадоў таму бардзюры ў прадпрыемства няма. Кіраўніцтва спецкамбіната гатова паставіцца да сітуацыі з разуменнем. Па заканадаўстве, з 1948 года да 1 ліпеня 1990-га на адну магілу бясплатна адводзіліся пяць квадратных метраў, пазней памер на адзіночнае пахаванне зменшаны ўдвая. Значыць, на агароджаным участку члены сям'і спачылай жанчыны маюць права яшчэ на адно бясплатнае месца, а за трэцяе трэба заплаціць каля 400 рублёў.

Сапраўды, па правілах, для замены помніка неабходна прывесці ўчастак у адпаведнасці з нормамі закона, але работнікі спецкамбіната запэўнілі журналіста, што не стануць перашкаджаць правядзенню работ у гэтым канкрэтным выпадку. Арганізацыя, якая будзе выконваць работы па добраўпарадкаванні, павінна паведаміць даглядчыку могілак аб тэрмінах. Пры жаданні члены сям'і могуць быць пахаваны ў межах адной агароджы, бо ў старыя пахаванні, як правіла, ужо не «ўціскаюцца».

Іншая справа з новымі могілкамі, як, напрыклад, у прыгарадзе Віцебска, Капцях, апошнім часам паўстала даволі сур'ёзная праблема недахопу месцаў для пахаванняў. Змены ў Законе Рэспублікі Беларусь № 55-З «Аб пахаванні і пахавальнай справе» ад 04.01.2021 запусцілі хвалю незадаволенасці сярод насельніцтва — пасля інвентарызацыі адведзеных участкаў высвятляецца, што захопленыя «лішнія» метры каштуюць нямала. А ў некаторых выпадках на адну магілу прыходзіцца 40 квадратаў абгароджанай тэрыторыі.

З пісьмамі, падобнымі на тое, якое даслаў у рэдакцыю Мікалай Карповіч, да кіраўніцтва спецкамбіната і гарвыканкама звяртаюцца масава. Рэгулярна — з наракannямі на вялікія сумы за зямлю. Але часцей насельніцтва ўсведамляе маштаб праблемы і, калі лічыць неабходным, рэзервуе метры побач з магіламі блізкіх — за год у Віцебску ўжо зроблена звыш 1500 рэзерваванняў.

Для жыхароў буйных гарадоў месца для вялікіх сямейных пахаванняў заўсёды каштавала немалых грошай, з часам гэта праблема толькі абвастраецца. Такая заканамернасць сусветнага быцця.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Камунальныя стасункі

# АД КАЛОДЗЕЖА ДА ДОМА

## Як «Мінскводаканал» мяняе каналізацыйныя трубы

**Сёлета ў сталіцы плануецца замяніць больш за 18,5 кіламетра каналізацыйных труб, і штогод гэтая лічба павялічваецца, сведчаць супрацоўнікі прадпрыемства «Мінскводаканал». Пакрысе ўсе трубы ў Мінску павінны быць заменены на пластыкавыя, якія гарантавана праслужаць гадоў 50 і больш.**



Кожны адкрыты калодзеж абавязкова праветрываецца.

### Скрозь зямлю

Мяняюць трубы, як правіла, бестраншэйным спосабам, не парушаючы інфраструктуру, то-бок новыя сеткі працягваюцца наўпрост скрозь старыя — пад зямлёй. Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як гэта робіцца ў Аўтазаводскім раёне сталіцы ў ваенным гарадку Сосны.




Газааналізатарам замяраецца наяўнасць у калодзежы газаў і кіслароду.

*— Мы ўваходзім у каналізацыйную трасу праз калодзеж і рухаемся па шляху пракладзенай старой трубы дыяметрам 150 мм,* — расказвае **Сяргей БОЙКА, слесар аварыйна-аднаўленчых работ «Мінскводаканала».** — *Бурыльны малаток раскалвае існуючыя камунікацыі, пасля расшыральнік павялічвае прастору ў траншэі, а следам цягнецца плець — злучаныя паміж сабой кавалкі пластыкавай трубы даўжынёй 65 см і дыяметрам 225 мм, якая становіцца новай камунікацыяй. І так да наступнага каналізацыйнага калодзежа.*

Нарыхтоўкі для труб наразаюць з шасціметровых канструкцый самі воднікі і робяць на іх насечкі, каб кавалкі злучаліся ў адну сетку. Старыя трубы рабіліся з розных матэрыялаў: кераміка, азбест, чыгун — усе іх можна разбіць, і іх кавалкі застаюцца пасля гэтага ў зямлі, тым самым надаючы новым камунікацыям своеасаблівую дадатковую абалонку. А вось калі сустракаюцца месцы, дзе калісьці былі правалы і дзе падчас рамонту ўкладвалі металічныя трубы, даводзіцца раскопваць паверхню і выцягваць старыя камунікацыі.

### Праветрыванне, замер, замена

Перш чым пачынаць работы, кожны каналізацыйны калодзеж



Мяняюць трубы каналізацыі без адключэння вады ў дамах, таму ў калодзежах заўжды вада.

пасля адкрыцця праветрываюць. Робяць першы замер на наяўнасць унутры метану, прапану, кіслароду. Праз 15 хвілін замяраюць другі раз. Бяспечна спускацца ўнутр, калі аб'ём кіслароду ў калодзежы 18—20 %, падзяліўся Сяргей Бойка:

*— Калі кіслароду менш за 18 % або больш за 23 %, лезці ў калодзеж небяспечна. Калі газааналізатар паказвае, што там газы або недастаткова кіслароду, то прадзімаем калодзеж. Калі гэта не дапамагае дасягнуць патрэбных паказчыкаў — ставім выцяжку. Калі не спрацоўвае і гэта — шукаем, адкуль ідзе газ.*

Калодзежы, дарэчы, таксама бываюць розныя. Збудаваныя пасля вайны, напрыклад, маюць глыбіню ўсяго 0,5—0,6 метра і такі ж дыяметр і сустракаюцца, як правіла, у цэнтры сталіцы. Найчасцей за ўсё калодзежы маюць глыбіню 2-2,5 метра, аднак сустракаюцца і 10-метровыя канструкцыі (прыёмачныя калектары).

*— Пры замене каналізацыйных труб старое кальцо вузкага калодзежа дэманціруецца і на яго месца ставіцца новае. Наша абсталяванне ўвогуле ў такія кольцы не ўлезе, паколькі яно мае дыяметр 85—90 см, а больш новыя малаткі ў зборы — увогуле 1,2 метра,* — патлумачыў **Аляксей СТАНКЕВІЧ, мантажнік вонкавых трубаправодаў 5-га разраду ўчастка будаўніцтва сетак каналізацыі «Мінскводаканала».** — *А бывае, сустракаюцца калодзежы глыбінёй метры чатыры, выкладзеныя з цэглы. Такія канструкцыі нагадваюць бутэльку, бо звужаюцца каля паверхні. Яны таксама мяняюцца на сучасныя бетонныя.*

Усяго ў сталіцы функцыянуе 2000 кіламетраў каналізацыйных сетак, і штодня ствараецца каля 460 тысяч м$^3$ сцёкавых вод.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ЖАНОЧАЯ «ПРАСТУДА»

## Ці можна назаўсёды пазбавіцца ад цыстыту?

**Тое, што цыстыт бывае ад пераахаладжэння, — міф. Можна захварэць, нават калі ўвесь час насіць цёплую бялізну і ніколі не садзіцца на халоднае. Бо галоўны віноўнік захворвання — мікробы.**
**Наш эксперт — уролаг вышэйшай катэгорыі Вольга АНТОНАВА — расказала, чаму цыстыт пераважна жаночая хвароба, каму нельга доўга цярпець і есці шмат салодкага, чым шкодныя стрынгі і штодзённыя пракладкі, а таксама да чаго прыводзіць хранічны цыстыт і ці можна ад яго пазбавіцца раз і назаўсёды.**



### Не тыя бактэрыі

— Цыстыты ў жанчын — адно з самых частых захворванняў. Кожная жанчына хоць раз у жыцці сутыкаецца з такой праблемай, ды прычын ёй шмат, — кажа Вольга Віктараўна. — У норме аналіз мачы стэрыльны, гэта значыць бактэрый у мачавым пузыры не павінна быць. Але часта з-за анатамічнай асаблівасці — кароткай урэтры — мікрафлора з вонкавых палавых органаў, з задняга прахода трапляе ў мачавы пузыр і там вельмі хутка выклікае запаленчы працэс, бо не заўсёды наш імунітэт спраўляецца з бактэрыямі.

> **«Хачу звярнуць увагу, што цыстыт вылечваецца. Не варта мучыцца, трэба ісці да ўролага, абследавацца і пазбавіцца ад яго раз і назаўсёды».**

***— Як пазнаць цыстыт і адрозніць яго, напрыклад, ад запалення ныркі?***

— Цыстыт праяўляе сябе пачашчаным хваравітым мочаспусканнем, частымі лжывымі пазывамі, рэзямі і болямі спазматычнага характару падчас і пасля мочаспускання (болі пры цыстыце заўсёды звязаны менавіта з мочаспусканнем). Таксама пацыенткі скардзяцца на болі над лонам унізе жывата, яны могуць аддаваць у пахвінную вобласць. Можа павышацца тэмпература цела да 37,2-37,5, але звычайна пры цыстыце не парушаецца агульны стан, няма вяласці, слабасці, млоснасці і высокай тэмпературы. Калі пакутуе агульны стан і далучаецца высокая тэмпература з дрыжыкамі, болямі ў спіне, то гэта характэрна для запалення ныркі — піеланефрыту.

### Цярпець не варта

***— Што садзейнічае цыстыту?***

— Да цыстытаў схільныя людзі, якія доўга цярпяць. Як толькі мы не ходзім у прыбіральню пяць-шэсць гадзін, то любая мікрафлора можа трапляць у мачавы пузыр і там размнажацца. Бактэрыі дасягаюць вялікай канцэнтрацыі і гэта можа садзейнічаць запаленню ў мачавым пузыры. Таму цярпець нельга — кожныя дзве гадзіны варта нагадваць сабе, што трэба наведаць дамскі туалет, пры першых пазывах таксама адразу туды накіроўвацца.

Другі момант — ужыванне салодкага ў вялікай колькасці. Салодкасці садзейнічаюць развіццю бактэрыяльнай флоры. Папросту кажучы, бактэрыі з задавальненнем харчуюцца глюкозай і актыўна размнажаюцца.

Трэці момант — актыўнае палавое жыццё жанчыны. Ёсць нават такое паняцце, як цыстыт «мядовага месяца». Падчас фрыкцый палавы партнёр можа заносіць бактэрыі ва ўрэтру, яны паднімаюцца ў мачавы пузыр — і развіваецца цыстыт. Тут важна, каб пасля сексу жанчына прытрымлівалася посткаітальнай прафілактыкі: памачыцца, старанна правесці гігіену, можна нават са спецыяльным мылам з антысептыкам. Калі такая праблема існуе, можна прыняць таблетку ўраантысептыка.

> **«Калі ў вас некалі быў цыстыт, стрынгі — гэта не ваш від бялізны».**

Таксама важна сказаць пра пераахаладжэнне. Само па сабе яно не выклікае цыстыт, аднак садзейнічае аслабленню імунітэту. Такім чынам бактэрыі, нічым не стрыманыя, могуць размнажыцца і выклікаць цыстыт. Таму каб не паўтараліся цыстыты, не рэкамендуецца пераахалоджвацца, ныраць у халодную ваду, плаваць пасля лазні ў халодным басейне, загартоўвацца.

Яшчэ адзін важны момант — стрынгі і штодзённыя пракладкі. Стрынгі — гэта своеасаблівы мосцік для пераходу бактэрый з задняга прахода ва ўрэтру. Многія дзяўчаты любяць іх насіць, і калі гэта не звязана ні з якімі наступствамі, калі ласка. А вось калі ў вас некалі быў цыстыт, стрынгі — гэта не ваш від бялізны. Штодзённыя пракладкі не заўсёды добра ўплываюць на мікрафлору пачатку похвы і ўрэтры. Часам яны могуць выклікаць парніковы эфект, узнікае дысбактэрыёз похвы, і шкодныя бактэрыі, якія распладзіліся, таксама могуць атакаваць урэтру і мачавы пузыр.

> **«Чым болей мы п'ём, тым хутчэй пазбаўляемся ад цыстыту. Максімальна павялічыўшы колькасць вадкасці, вы прамываеце мачавы пузыр».**

У жанчын у перыменапаўзе, звычайна пасля 45 гадоў, зніжаецца ўзровень палавых гармонаў эстрагенаў. Па гэтай прычыне слізістая, у тым ліку і мачавога пузыра, бо гэта гармоназалежная зона, становіцца тонкай і не так паўнацэнна спраўляецца з любым бактэрыяльным абсяменненнем. Таму недахоп эстрагенаў з'яўляецца спрыяльным фактарам для развіцця цыстыту ў постменапаўзе ў перыяд клімаксу. Таксім жанчынам у клімактэрычным перыядзе ці перад клімаксам пасля кансультацыі з гінеколагам і эндакрынолагам можа прызначацца мясцовая гарманальная тэрапія, якая вырашае праблему рэцыдыўных цыстытаў. Слізістая становіцца больш шчыльнай і паўнацэннай, а значыць больш абароненай.

***— Як дыягнастуецца цыстыт і як хутка прызначаецца лячэнне? Як яго лечаць і ці патрэбны тут антыбіётыкі?***

— Цыстыт дыягнастуецца па клінічнай карціне — скаргі пацыента, агляд урача. Плюс агульны аналіз мачы. Сёння ёсць магчымасць рабіць яго экспрэс-метадам — за дзве хвіліны. Пры цыстыце характэрна павышэнне лейкацытаў, часам сляды бялку і нават крыві.

Сёння цалкам вылечыць цыстыт без антыбіётыкаў, на мой погляд, складана. Мікрафлора становіцца больш агрэсіўнай і менш рэагуе на ўраантысептыкі і хіміяпрэпараты. Развіваецца ўстойлівасць, і гэта агульнасусветная праблема. Таму прызначэнні ўрач робіць эмпірычна — тое, што дапамагае ў большасці выпадкаў. Па пратаколах прэпарат першай лініі — разавы пакуначак з антыбіётыкам. Курс антыбіётыка на пяць дзён дае гарантыю, што захворванне не паўторыцца і не пацягне шлейф хранічнага запалення.

### Грэлка, журавінавы морс, ураантысептык

***— Што рабіць, каб аблегчыць сімптомы захворвання ў хатніх умовах, калі захорванне абвастрылася ўвечары ці ўначы?***

— Першае, што можа дапамагчы — гэта сухое цяпло. Грэлку ці бутэльку з гарачай вадой можна палажыць на 10 хвілін паміж ног ці ўнізе жывата. Другое — выпіць кісла-салодкі журавінавы морс ці чай з рамонкам. Увогуле, чым болей мы п'ём, тым хутчэй пазбаўляемся ад цыстыту. Максімальна павялічыўшы колькасць вадкасці, вы прамываеце мачавы пузыр. Не пашкодзіць і ўраантысептык, ён прадаецца без рэцэпту. Яго ўвогуле можна трымаць пад рукой, калі праблема частая. А больш сур'ёзныя прэпараты, у прыватнасці антыбіётык, прызначае толькі уролаг, да якога варта звярнуцца на наступны дзень.

> **«Салодкасці садзейнічаюць развіццю бактэрыяльнай флоры. Папросту кажучы, бактэрыі з задавальненнем харчуюцца глюкозай і актыўна размнажаюцца».**

***— Ці можа цыстыт у жанчыны выклікаць прастатыт у яе партнёра?***

— Наўпрост цыстыт у жанчыны не выклікае запаленне ў партнёра. Гэта жаночая праблема з мочаспусканнем, якая не перадаецца палавым шляхам. Іншая справа, калі цыстыт спалучаецца з вагінітам, вагінозам ці дысбактэрыёзам похвы. Такая патагенная флора можа перадавацца партнёру і выклікаць у яго ўрэтрыт, узыходзячым шляхам можа развівацца і запаленне ў прастаце. Сам па сабе цыстыт для мужчыны не небяспечны. Іншая справа, што падчас цыстыту не рэкамендуецца палавое жыццё, варта дачакацца, каб жанчына паправілася.

### Ну вось, зноў!

***— У якіх выпадках цыстыт пераходзіць у хранічную форму?***

— Гэта залежыць ад імунітэту жанчыны і спадарожных фактараў, такіх як гарманальны фон, палавая актыўнасць (чым часцей, тым вышэй рызыка), недахопу эстрагенаў у перадменапаўзе, калі слізістая стончаная і сухая. Калі ў жанчыны ёсць праблемы з кішэчнікам, будуць частыя цыстыты, бо наўпрост лішак патагеннай флоры ўплывае на развіццё цыстыту. Важны і лад жыцця: выключыць шмат салодкага і пераахаладжэнні. Імунітэт, фактары знешняга асяроддзя і гарманальны фон — тры моманты, на якія варта звяртаць увагу.

***— Ці можа хранічны цыстыт прыводзіць да лейкаплакіі мачавога пузыра?***

— Цыстыт больш за два разы за паўгода ці больш за тры разы на год лічыцца рэцыдыўным, або хранічным. Пры ім парушаецца якасць жыцця, бо жанчына толькі і думае, як бы ён не развіўся, што яна будзе рабіць і да каго звяртацца. Каб назаўсёды пазбавіць чалавека ад рэцыдываў, варта дасканальна абследавацца, пракансультавацца ў сумежных спецыялістаў — гінеколага, эндакрынолага, калі ёсць праблемы з кішэчнікам — у гастраэнтэролага.



Але найперш гэта абследаванне ўролага. Самым дакладным метадам даследавання лічыцца цыстаскапія. Яна ў падрабязнасцях даследуе кожны міліметр слізістай мачавога пузыра знутры і ўрэтру. Тонкая трубачка, якая мае на канцы відэакамеру, заводзіцца праз урэтру пад мясцовым абязбольваннем у мачавы пузыр. Гэта безбольная працэрура, якая дазваляе высвеціць наяўнасць лейкаплакіі мачавога пузыра. Лейкаплакія — змененая слізістая ў выніку хранічнага запалення. Калі здараецца рэцыдыў за рэцыдывам, гэта вядзе да таго, што слізістая — празрыстая і тонкая — пераўтвараецца ў тоўстую, белага колеру, падобную да скуры. І гэта плёнка не дасць камфортна жыць.

### Раз і назаўсёды

***— Пра лейкаплакію нельга не ведаць? Яна не праходзіць схавана?***

— Так. Яна будзе праяўляцца рэцыдывамі цыстытаў, пастаяннымі болямі, нават без сувязі з мочаспусканнем, частымі ілжывымі пазывамі, пачуццём няпоўнага апаражнення. Заўсёды будзе дыскамфорт, звязаны з мочаспусканнем і ўнізе жывата. Калі цыстыт здараецца не менш, чым два разы за паўгода ці тры разы на год, варта прайсці цыстаскапію.

Калі выяўляецца лейкаплакія, гэта сведчыць пра тое, што таблеткамі цыстыт ужо не вылечыш. Можна аблегчыць пачатак, абвастрэнне, але назаўсёды ад яго пазбавіцца можна, толькі прыбраўшы лейкаплакію.

> **«Да цыстытаў схільныя людзі, якія доўга цярпяць. Як толькі мы не ходзім у прыбіральню пяць-шэсць гадзін, то любая мікрафлора можа трапляць у мачавы пузыр і там размнажацца».**

Самы сучасны метад лячэння лейкаплакіі — выпарванне лазарам. Гэта мікрааперацыя пад агульным абязбольваннем. Лазер раствараe паталагічную тканку, на яе месцы вырастае здаровая слізістая, якая выконвае сваю функцыю, мае добры імунітэт і змагаецца з бактэрыямі. У такой жанчыны цыстыт не паўтараецца.

Таму хачу звярнуць увагу, што цыстыт вылечваецца. Не варта мучыцца, трэба ісці да ўролага, абследавацца і пазбавіцца ад яго раз і назаўсёды.

***— Якой мусіць быць прафілактыка цыстыту?***

— Прафілактыка — гэта перш за ўсё клопат і ўважлівае стаўленне да сябе. Паменей салодкага, добрая гігіена, шмат вадкасці — да двух літраў у дзень (да васьмі гадзін вечара, каб не бегаць у прыбіральню ўначы), не трываць, быць у цяпле, пасля сексу памачыцца і старанна памыцца. Калі цыстыт посткаітальны, варта прыняць таблетку ўраантысептыка. Важна своечасова лячыць гінекалагічныя паталогіі і паталогіі кішэчніка. Выраўняць гарманальны фон. Калі глядзець на праблему ў комплексе, будзе добры вынік.

Ёсць і вакцына ад цыстыту ў выглядзе капсул. Яе прымаюць да сняданку на працягу трох месяцаў. Яна стварае імунітэт ад самага частага ўзбуджальніка цыстыту — кішэчнай палачкі, і рэцыдывы становяцца радзейшымі. Гэта спецыфічная прафілактыка.

***— Вакцыну мусіць прызначаць толькі ўрач? Для яе прымянення варта дачакацца выздараўлення?***

— Яна можа прымяняцца і ў вострым перыядзе, калі маецца само захворванне, і ў фазе рэмісіі. Вакцына прадаецца без рэцэпту, але лепш па прызначэнні ўрача. Калі ў вас маецца лейкаплакія, то толькі таблеткамі справіцца нельга, а сума на лекі будзе патрачана.







# УСІМ РАМЁСТВАМ БАЦЬКА

## Найлепшы каваль Беларусі жыве ў Мсціславе





Сам замак у старажытным Мсціславе, на жаль, не захаваўся, а вось легенда пра яго і гарадзішча, што ў народзе называецца Замкавай гарой, жыве, там кожны год адбываюцца знакамітыя рыцарскія фэсты. Адзін з удзельнікаў, жыхар гэтага сярэднявечнага горада, падчас свята надзявае жалезныя латы, кальчугу, шлем, бярэ меч і шчыт, падымаецца на гару і далучаецца да іншых ваяроў. Гэта мясцовы саракадвухгадовы каваль Сяргей Кудзікаў, адзіны на ўсё наваколле рамеснік па традыцыйнай коўцы, які ашчадна захоўвае і развівае старажытныя кавальскія тэхналогіі. Сябра Саюза майстроў народнай творчасці Беларусі, кіраўнік дзіцячага аб'яднання «Майстар і метал» пры раённым Доме рамёстваў і кіраўнік клуба гістарычнай рэканструкцыі «Мсціслаўская харугва», ён стварае рыцарскія даспехі і гістарычную зброю, робіць мастацкія эксклюзіўныя ўпрыгажэнні для інтэр'еру і побыту. Мне выпаў гонар папрысутнічаць у самым сэрцы працы Замкавага (так яго цяпер называюць) каваля — яго кузні, паглядзець, як лёгка і спорна ён спраўляецца з нагрэтым да чырвані металам, адчуць творчую атмасферу і той непараўнальны водар, які ўтварае металічная акаліна, агонь і вада, куды апускаецца гарачы метал.

— Калі ў старажытнасці ў Мсціславе быў замак, значыць былі і кавалі, — упэўнена сцвярджае Сяргей, адкладваючы ўбок молат і выціраючы са скроняў кроплі поту. — Мясцовая кавальская традыцыя не павінна знікнуць. Я хачу, каб мае землякі не цураліся сваёй слаўнай мінуўшчыны, займаліся рамёствамі, удзельнічалі ў нашым брэндавым свяце.

Сяргей Кудзікаў у кавальстве амаль дзесяць гадоў. Перад гэтым працаваў майстрам вытворчага навучання па інфарматыцы і ЭВМ у мясцовым будаўнічым каледжы. Калі пачалася эра рыцарскіх фэстаў, яго моцна «прыкавала» гэтая нязведаная дагэтуль стыхія. Пачынаў як «кравец» рыцарскага абмундзіравання. Пазней і ў кавальскіх справах спакваля дасягаў досведу і сапраўдных вышынь. «Каваль — усім рамёствам бацька», — часта гаворыць Кудзікаў. За свае ўмельства і ўдзел у грамадскім жыцці Сяргей быў узнагароджаны званнем «Чалавек года» горада Мсціслава. Ён часта прымае ўдзел у святах самадзейных майстроў, двойчы перамагаў на фестывалях «Вясновы букет» у Мінску, летась у Бялынічах на Дні беларускага пісьменства атрымаў Гран-пры, а сёлета на фестывалі «Славянскі базар» у намінацыі «Захаванне старажытных тэхналогій» стаў найлепшым кавалём Беларусі.

Калі прыходзіць час чарговага рыцарскага фэсту, Сяргей зачыняе кузню і некалькі дзён жыве ў іншым — гістарычным — вымярэнні. А гэты год у мсціслаўскага каваля ўвогуле асаблівы: ён стаў студэнтам-першакурснікам завочнага аддзялення факультэта Беларускай акадэміі культуры і мастацтваў.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў пра апантанага каваля глядзіце на сайце zviazda.by*



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Минский подшипниковый завод», г. Минск, ул. Жилуновича, 2** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона**

**Незавершенное законсервированное строение –** готовность 82 % (назначение: здание неустановленного назначения, общ. пл. 857,6 кв. м, инвент. № 500/U-1026105). Местоположение: **г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0944 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 31.07.2053) для обслуживания здания неустановленного назначения

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 465 563,96 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 3 (три) процента от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 24.08.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.09.2022 с 13.00 до 14.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.09.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны:+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Смолевичский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимости и оборудования в составе:**

**НЕДВИЖИМОЕ ИМУЩЕСТВО:**

- **здание механического цеха общей площадью 4 492,3 кв. м с инв. № 614/С-26092;**
- **здание материального склада** *(составные части и принадлежности: пристройка)* **общей площадью 246,0 кв. м с инв. № 614/С-31821;**
- **здание автогаража общей площадью 422,3 кв. м с инв. № 614/С-26095;**
- **здание проходной общей площадью 14,8 кв. м с инв. № 614/С-26096;**
- **ограждение общей площадью 530,2 кв. м с инв. № 614/С-31825;**
- **открытая площадка для хранения металла общей площадью 4395,5 кв. м с инв. № 614/С-26097.**

**ОБОРУДОВАНИЕ:**

- **котел стальной твердотопливный КСТБ-95 с оборудованием, инв. № 01000105КЗ;**
- **кран консольный, поворотный, инв. № 00006377КЗ;**
- **кран 2 тн., ручной, инв. № 00006322КЗ;**
- **кран козловой К-09, инв. № 00006311КЗ;**
- **кран подвесной 2 тн., инв. № 00006577КЗ;**
- **кран подвесной 3 тн., инв. № 00006317КЗ;**
- **кран подвесной 3 тн., инв. № 00006318КЗ;**
- **кран подвесной 3 тн., инв. № 00006319КЗ;**
- **монорельс, инв. № 00006314КЗ;**
- **теплосчетчик 7034, инв. № 7034;**
- **трансформатор ТКГ-400, инв. № 00001847КЗ;**
- **электроталь 1 тн., инв. № 00006308КЗ;**
- **электроталь Н12 0,5 тн., инв. № 00006541КЗ;**
- **электроталь НРБ, инв. № 00006569КЗ;**
- **котел КСТГ-16/2007.**

**Объекты расположены на земельных участках с кадастровыми номерами 624884507601000103** *(право постоянного пользования)* **и 624884507601000196** *(право постоянного пользования)* **площадью 3,1177 га и 0,8486 га соответственно по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п.Черницкий.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **1 215 958,80** бел. руб.
